ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 37 (4992) 21 верасня 2018 г.

ISSN 0024-4686

16+

Пушчанскі паэтычны голас
стар. 5

Станаўленне чацвёртай сталіцы
стар. 10

Вяршыні Маргарыты Ляўчук
стар. 15

Фота прадстаўлена Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі.

КНІГА НА ЎСЕ ЧАСЫ

Яна стала вызначальнай для развіцця беларускай культуры. Але яна значная наогул для чалавечай цывілізацыі — у гэтым можна ўпэўніцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, дзе ўчора адкрылася выстаўка-сенсацыя: упершыню ў нашу краіну прыехалі кніжныя рарытэты сусветнай значнасці, узрост некаторых дасягае 5 тысяч гадоў. На працягу месяца ўнікальныя экспанаты будуць прадстаўленыя ў межах міжнароднай выстаўкі «Беларусь і Біблія» ў Музеі кнігі.

Цяпер тут пануе кніга, якая стала найбольш папулярнай у свеце, якую перапісвалі і выдавалі, а таксама працягваюць выдаваць цяпер у розных краінах свету. Але арганізатары пастараліся нагадаць нават перадгісторыю: у экспазіцыі можна пабачыць клінапісныя тэксты, якія паходзяць з горада Ура, радзімы Аўраама. Цудоўная магчымасць пабачыць старажытныя кнігі, што стваралісяна гліняных таблічках 5—4 тысячы гадоў таму. Ды і старажытнагрэчаскія тэксты маюць выключнае значэнне для еўрапейскай культуры, напрыклад, «Іліяда» Гамера — пабачым папірус на грэчаскай мове, што быў напісаны яшчэ да нашай эры.

Адметныя кнігі першых перакладаў Бібліі на нацыянальныя мовы. І ў гэтую палітру ўпісаныя беларускія выданні Скарыны і яго нашчадкаў. Якім чынам — пра гэта мы падрабязна распавядзём у наступным нумары.

Фота прадстаўлена рэдакцыяй газеты «СБ. Беларусь сегодня».

На фота:

Уверсе — металічная аправа куцеінскага выдання Новага Запавету і Псалтыра. 1652 г. Нацыянальная бібліятэка Беларусі.

Унізе — клінапіс шумераў на гліняным цыліндры. 3000—2000 г. да н. э. Музей хрысціянскіх місій, Паўднёвая Карэя.

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 18037

Акцэнты тыдня:

краіна

Віншаванні. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў удзельнікаў Міжнароднай асацыяцыі акадэмій навук з 25-годдзем яе дзейнасці. «Чвэрць стагоддзя таму акадэміі маладых незалежных рэспублік аб'ядналіся з мэтай зберагчы лепшую спадчыну савецкага мінулага», — гаворыцца ў віншаванні. Аляксандр Лукашэнка перакананы, што Мінск стане новай інтэграцыйнай пляцоўкай, дзе ўдзельнікі асацыяцыі змогуць весці канструктыўныя перагаворы, развіваць міжакадэмічныя сувязі, выпрацоўваць далейшыя шляхі ўзаемадзеяння не толькі вядомых, але і маладых вучоных.

Літаратурная падзея. Падведзены вынікі літаратурнага конкурсу «Ліга аўтараў — 2018», паведамілі ў Міністэрстве інфармацыі Беларусі. Першы тур конкурсу быў прысвечаны тэме «Мая малая радзіма», другі — лёсавызначальным падзеям у жыцці беларускай зямлі, трэці — «Дарога ў заўтра» — разважанням пра мінулае і будучыню. У намінацыі «Проза» пераможцай прызнана Марына Семяненя, у намінацыі «Паэзія» — Наталля Саветная. Крытэрыямі, якімі кіраваліся пры выбары пераможцаў, служылі аргументаванасць і глыбіня раскрыцця зместу, актуальнасць і значнасць ідэі, аб'ектыўнасць, мастацкі ўзровень твора. Літаратурны конкурс «Ліга аўтараў — 2018» быў абвешчаны ў сакавіку Саюзам пісьменнікаў Беларусі, Рэспубліканскай грамадскай арганізацыяй «Белая Русь» пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі і Выдавецкага дома «Звязда».

Конкурс для юных. У Мінску вядомыя людзі павіншавалі юных пераможцаў рэспубліканскага паэтычнага конкурсу «Шчасце жыць у мірнай краіне!». Кожны з гасцей выбіраў найбольш упадабаны твор з кнігі «Дзеці за мір. Вершы», у якую ўключана больш за 150 вершаў. Усе яны — лепшыя па выніках адбораў конкурсу па Беларусі. Цырымонія ўзнагароджання пераможцаў стала таксама прэзентацыяй гэтага выдання, якое хуткім часам паступіць ва ўсе раённыя бібліятэкі. Юных аўтараў павіншаваў з Днём міру і перамогай старшыня праўлення Беларускага фонду міру, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Максім Місько.

Беларускае кіно. Праект «Беларусьфільм-95», прысвечаны 95-годдзю кінастудыі, стартаваў у мінскім кінатэатры «Піянер». Гледачам прапануюць паглядзець ігравое, анімацыйнае і неігравое кіно беларускай вытворчасці. З залатой калекцыі кінастудыі прадставяць мастацкія фільмы «Альпійская балада» і «Ідзі і глядзі». Пра іх раскажуць самі ўдзельнікі творчай групы. Як раней адзначаў генеральны дырэктар «Беларусьфільма» Уладзімір Карачэўскі, праграма паказаў распісана да снежня 2019 года.

Імідж сталіцы. Мінск узначаліў рэйтынг самых папулярных гарадоў СНД для асенніх падарожжаў. Такую інфармацыю прыводзіць аналітычнае агенцтва «Турстат», паведамляе БелТА. У першую дзясятку самых папулярных для турпаездак гарадоў восенню 2018 года ўвайшлі Мінск, Астана (Казахстан), Баку (Азербайджан), Ерэван (Арменія), Ташкент (Узбекістан), Алматы (Казахстан), Бішкек (Кыргызстан), Кішынёў (Малдова), Душанбэ (Таджыкістан) і Ашхабад (Туркменістан).

Стасункі рэгіёнаў. Італьянскі Неапаль выказаў цікавасць у супрацоўніцтве з беларускім Гомелем, паведаміла кіраўнік Беларускага культурнага грамадства *Bellarus* у Неапалі Таццяна Пумпулева падчас сустрэчы з намеснікам старшыні Гомельскага гарвыканкама Віталем Атаманчуком. У ліку прыярытэтных сфер супрацоўніцтва пазначаны эканоміка, турызм і адукацыя, паведамляе БелТА. На сёння ў межах партнёрскіх пабрацімскіх адносін наладжаны кантакт абласнога цэнтра з 32 гарадамі свету.

Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі

КУТОЧАК БЕЛАРУСІ Ў АСТАНЕ

У межах Міжнароднага кангрэса чытання, які адбыўся ў Астане ў Нацыянальнай акадэмічнай бібліятэцы Рэспублікі Казахстан, па ініцыятыве Саюза пісьменнікаў Беларусі быў адкрыты беларускі літаратурна-культурны цэнтр.

Фота Уладзіслава Цыдзіка.

Алена Стэльмах перадае казахстанскаму боку макет БелАЗа.

Падчас правядзення кангрэса пісьменнікі больш як 50 краін выказалі заклапочанасць культурай чытання ў сучасным свеце. Менавіта кніга, як прагучала падчас абмеркавання гэтай праблемы, з'яўляецца той непераўзыдзенай крыніцай ведаў, якая фарміруе чалавека як асобу. Мастацкая літаратура — своеасаблівы феномен, які абуджае ў чалавеку лепшыя якасці і ўзбагачае яго духоўны патэнцыял. Творцы падкрэслівалі значнасць чытання для будучыні, бо ад гэтага шмат у чым залежыць развіццё грамадства, узаемаадносіны паміж краінамі, сяброўства паміж народамі.

Асаблівую значнасць мае нацыянальная літаратура — як культурная і духоўная спадчына народа. Першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена Стэльмах выступіла на кангрэсе з дакладам «Традыцыі і навацыі ў сучаснай беларускай літаратуры», прадставіла айчынную літаратуру, вытокі якой ідуць з глыбіні стагоддзяў, і распавяла пра новыя тэндэнцыі беларускага мастацкага слова.

Адкрыццё беларускага літаратурна-культурнага цэнтра ў галоўным кніжным храме Астаны дазволіць бліжэй пазнаёміцца з Беларуссю казахстанскаму чытачу, запэўніла дырэктар бібліятэкі Умітхан Муналбаева. Пра важнасць чытання і пра тое, што Беларусь застаецца адной з краін, якія чытаюць найбольш, паведаў другі сакратар Пасольства Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Казахстан Ігар Іваноў.

Нацыянальнай акадэмічнай бібліятэцы Казахстана падаравана бібліятэчка Саюза пісьменнікаў Беларусі з творамі класікаў нацыянальнай літаратуры і з кнігамі сучасных пісьменнікаў, іх аўтографамі і пажаданнямі.

Казахстанскаму боку былі перададзены і своеасаблівыя сімвалы Беларусі — макет самага вялікага кар'ернага самазвала БелАЗ і макеты трактароў Мінскага трактарнага завода.

Акрамя таго, у бібліятэчнай зале «Мастацтва» адбылася прэзентацыя творчага праекта з Беларусі — кнігі і фотавыстаўкі Уладзіслава Цыдзіка з аднайменнай назвай «Бачу Беларусь такой». Дарэчы, у выданні змешчаны вершы 65 сучасных беларускіх паэтаў. Усё гэта стала асновай для літаратурна-культурнага цэнтра, які мае намер умацаваць Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Казахстан Анатоль Нічкасаў. Анатоль Іванавіч выказаў жаданне папоўніць фонды акадэмічнай бібліятэкі кніжнымі навінкамі з Беларусі. Гэтаму рады і ўдзельнікі беларускага культурнага цэнтра «Радзіма», які аб'ядноўвае беларусаў Астаны. Яго старшыня Дзмітрый Астаньковіч адзначыў важнасць сувязі з радзімай і запэўніў, што і за яе межамі беларусы робяць усё магчымае, каб умацоўваць аўтарытэт сваёй Айчыны.

Падчас адкрыцця цэнтра прагучалі шчырыя песні пра Казахстан і Беларусь барда Генадзя Парыкіна, які больш як 30 гадоў пражыў у Казахстане і вярнуўся ў Беларусь.

— Наша супрацоўніцтва яшчэ раз пацвярджае вялікую дыпламатычную місію кнігі, — падкрэсліла Алена Стэльмах. — Мы вельмі рады, што літаратура служыць збліжэнню народаў, нашаму духоўнаму сваяцтву. Паміж літаратарамі Беларусі і Казахстана існуюць даўнія творчыя сувязі. Сімвалічна, што ў вельмі прэстыжным месцы Астаны — акадэмічнай бібліятэцы — будзе яшчэ адзін куточак Беларусі.

Марыя ЛІПЕНЬ

З нагоды

«ХВАЛІЦЕ ІМЯ ГАСПОДНЕ»

Дні праваслаўнай культуры пройдуць з 19 верасня па 4 лістапада. Насычаная праграма пачалася ў сталічнай бібліятэцы № 19 з фотавыстаўкі «Хрэсны ход» грамадскага куратара фотагалерэй Канстанціна Мельніка, творчага вечара паэта, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Вольгі Шпакевіч і вечара духоўнай музыкі і паэзіі.

У Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь (5 кастрычніка ў 16.00) адбудзецца канцэрт духоўных песнапенняў, музыкі і аўтарскай паэзіі членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі.

У Мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» (17 кастрычніка ў 17.00) адкрыюцца дзве персанальныя выстаўкі. На першай «Таямнічы свет беларускіх ікон» іканапіснай майстэрні Віктара Доўнара «ICONIQUE» можна будзе ўбачыць спісы цудатворных ікон Божай Маці (Жыровіцкай, Лагойскай, Мінскай, Мар'інагорскай і інш.), а таксама святочныя іконы з храма святой праведнай Сафіі Слуцкай. Другую пад назвай «Хай будзе воля Твая» прадставіць мастак-іканапісец Васіль Бірук. Запланаваны і канцэрт духоўных песнапенняў, музыкі і аўтарскай паэзіі членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі.

У Доме кнігі імя Уладзіміра Караткевіча ў г. Рагачове (28 кастрычніка у 12.00) адбудзецца творчы вечар члена СПБ Тамары Лявішкі з прэзентацыяй яе кнігі «Благодатию Божией утверждённый…» пра гісторыю Ціхініцкага Свята-Міхайлаўскага храма ў фактах і дакументах. У гэты ж дзень запланаваны і прагляд фільма-перадачы (зняты па другой частцы гэтай кнігі) пра лёс жыхароў Рагачоўскага раёна, якія пакутавалі за хрысціянскую веру ў 1930—1940-я гады. Завершыцца творчы вечар канцэртам духоўных песнапенняў, музыкі і аўтарскай паэзіі членаў СПБ.

У Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (31 кастрычніка у 17.00) пройдзе лекцыя «Старажытна-хрысціянскі жывапіс і сучаснае мастацтва» мастака-іканапісца Віктара Доўнара, пасля якой пройдзе вечар духоўнай паэзіі і музыкі. Аўтарскую паэзію прадставяць члены СПБ Алена Міхаленка і Лізавета Палеес. Адбудзецца выступленне, падрыхтаванае педагогамі і вучнямі школы № 19 г. Мінска.

Завершыцца праграма гала-канцэртам «Хваліце імя Гасподне» ў 13.00 у Палацы культуры прафсаюзаў. Канцэрт званароў, духоўныя песнапенні, музыка, аўтарская паэзія, выступленне артыстаў эстрады пачнецца ў 13.00.

Уваход на ўсе мерапрыемствы вольны. Запрашальныя білеты на гала-канцэрт можна знайсці ў царкоўнай лаўцы.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Мінскае гарадское аддзяленне СПБ запрашае:

25 верасня *— на сустрэчу пісьменніцы Ірыны Лявонавай з вучнямі 4-х і 10-х класаў у СШ № 168 (10.30 і 11.30).*

26 верасня *— на прэзентацыю кнігі вершаў Аляксандра Паршанкова «Жатва» ў гістфак БДУ (13.00).*

26 верасня *— на паэтычна-песенную імпрэзу «Водгукі мужнасці і памяці» з удзелам паэтаў Мікалая Іванова і Таццяны Купрыянец у Мінскі гарадскі тэатр паэзіі (18.00).*

26 верасня *— на пасяджэнне літаратурнага клуба «Аўтограф» (вул. Карбышава, 42) з удзелам пісьменніка Юрася Нератка (19.00).*

27 верасня *— на сустрэчу з літаратуразнаўцам Людмілай Вараб'ёвай у публічную бібліятэку № 5 (17.00).*

27, 28 верасня *— на імпрэзу ў межах Міжнароднага літаратурнага фестывалю ў Пінск з удзелам паэтаў гарадскога аддзялення СПБ (10.00).*

Брэсцкае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

26 верасня *— на пасяджэнне літаратурнага клуба «Адкрыццё!» у Брэсцкую цэнтральную бібліятэку імя А. С. Пушкіна (17.00).*

27 верасня *— на пасяджэнне Школы маладога літаратара ў офіс абласнога аддзялення СПБ (17.00).*

Гродзенскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

21 верасня *— на пасяджэнне чытацкага клуба «Сябрына» з удзелам Анатоля Апанасевіча ў гарадскую бібліятэку № 1 г. Гродна (14.30).*

22 верасня *— на сустрэчу з Ірынай Фамянковай у межах праекта «Творы і творцы» ў Гродзенскую абласную навуковую бібліятэку імя Я. Ф. Карскага (11.00).*

Магілёўскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

21 верасня *— на імпрэзу «Душы яго крыніца» з нагоды 60-годдзя старшыні абласнога аддзялення СПБ Алеся Казекі з удзелам юбіляра Міколы Леўчанкі ў кінатэатр «Радзіма» г. Быхава (12.00).*

24 верасня *— на імпрэзу, прысвечаную памяці паэткі, дацэнта МДУ імя А. А. Куляшова Тамары Капейкі (Лапшыной), з удзелам кіраўніка літаратурнага аб'яднання «Натхненне» ўніверсітэта Наталлі Міхальчук (аўд. 353) (15.00).*

25 верасня *— у літаратурную гасцёўню «Магія слова» з удзелам Алены Кісель у Магілёўскую абласную бібліятэку імя У. І. Леніна (18.00).*

27 верасня *— на адкрыццё Літаратурнага фестывалю «Ніць» у межах Еўразійскага міжнароднага фэсту культур з удзелам Алеся Казекі на пл. Зорак і вул. Леніна г. Пінска (12.00).*

Фестывалі

ДЗЕ ЖЫВУЦЬ ГАНАРОВЫЯ ПАЛЕШУКІ?

Заўтра ў аграгарадку Ляскавічы адбудзецца V Міжнародны фестываль этнакультурных традыцый «Кліч Палесся»

Сёлета фэст, які стаў візітоўкай Петрыкаўскага раёна, збярэ каля 30 тысяч гасцей і з'яднае жыхароў беларускага Палесся, Расіі і Украіны. Чакаюцца таксама госці з Польшчы, Латвіі і іншых краін. Падчас адкрыцця свята будуць агучаны імёны прадстаўнікоў Гомельскай і Брэсцкай абласцей, якія ўдастоены спецыяльнага звання «Ганаровы паляшук».

— Прыпяцкае Палессе да нашых дзён захавала рысы самабытнай культуры і побыту палешукоў. І наш абавязак — беражліва ставіцца да традыцый, якія стагоддзі таму заклалі продкі. Гэта нашы вытокі, таму фестываль неабходна правесці на самым высокім узроўні і зрабіць выдатнае свята для людзей, — лічыць кіраўнік аргкамітэта Міхаіл Русы.

Паводле задумы аргкамітэта, канцэпцыя міжнароднага фестывалю адлюстравана ў назве адной з пляцовак — «У сваім краі як у раі». Прадстаўнікі Прыпяцкага рэгіёна на тэматычных падворках адновяць традыцыі і каларыт паселішчаў Палескага краю. Гасцей будуць сустракаць музычна-тэатралізаванай пастаноўкай, якая раскрывае версію паходжання незвычайных назваў вёсак. Удзельнікаў фэсту запросяць на дэгустацыю страў па старадаўніх рэцэптурах, марафон «Танчым па-даўнейшаму», конкурс «Палеская прыгажуня». Арганізатары рыхтуюць народныя забавы, пазнавальныя акцыі, шматлікія конкурсы. Для камфорту гасцей свята кожную гадзіну ад райцэнтраў Петрыкаў і Жыткавічы будуць курсіраваць дадатковыя маршруты да Ляскавіч.

Міжнародны фестываль «Кліч Палесся» накіраваны на захаванне і папулярызацыю этнакультурных традыцый, вывучэнне і падтрымку багатай гісторыка-культурнай спадчыны рэгіёна, а таксама ўмацаванне творчых сувязей прыгранічных рэгіёнаў. Арганізатарамі фэсту выступаюць Міністэрства культуры Беларусі, Гомельскі і Брэсцкі аблвыканкамы, Нацыянальны парк «Прыпяцкі».

Міра ІЎКОВІЧ

ВыДАТна

З ЭПОХІ АСОБ

Юрый Траян: паўстагоддзя ў балеце

Сёння Вялікі тэатр прысвячае вечар мастацкаму кіраўніку балета народнаму артысту Беларусі Юрыю Траяну, творчая дзейнасць якога пачалася 50 гадоў таму. Паказ балета П. Чайкоўскага «Лебядзінае возера» 21 верасня адбудзецца ў гонар артыста, якому выпала пражыць эпоху ў тэатры.



Юрый Траян у пастаноўцы «Тыль Уленшпігель»

Сёння падчас паказу за дырыжорскім пультам будзе маэстра Вячаслаў Чарнуха-Воліч. Балет, што ўвасабляе вечную класіку, заўсёды прыцягвае публіку і з'яўляецца прыкладам вытанчанасці і хараства, за што любяць гэты від мастацтва ва ўсім свеце.

Аднак як артыст Юрый Траян для аматараў балета з'яўляецца адной з тых асоб, дзякуючы якім у нашым тэатры сцвярджалася новая эпоха з іншай харэаграфіяй. Гэта была эпоха асоб — у выбухных пастаноўках В. Еліза'ерва і ў экспрэсіўным выкананні артыстаў, што праз сваё цела распавядалі яркія гісторыі, зараджалі энергіяй. Адным з такіх артыстаў быў Юрый Траян. Сёння артыст успамінае, што ўпершыню на гэтую сцэну выйшаў, калі быў дзіцём. Яго мама працавала касцюмерам у тэатры, а ён з васьмі гадоў праводзіў час тут і нават засынаў у кулісах… У верасні 1968 года Юрый Траян быў прыняты ў трупу Вялікага тэатра Беларусі пасля заканчэння харэаграфічнага вучылішча.

Пік яго артыстычнай кар'еры прыпаў на той час, калі беларускі балет набываў шырокую вядомасць у свеце і ў выніку стаў пазнавальным брэндам. Юрый Траян быў першым выканаўцам партый Хазэ ў «Кармэн-сюіце» Ж. Бізэ — Р. Шчадрына, Спартака ў балеце А. Хачатурана, Паэта ў «Карміне Бурана» К. Орфа, Адама ў «Стварэнні свету» А. Пятрова. І дзякуючы гэтаму артысту ў айчынных гледачоў складвалася ўяўленне пра беларускі балет з пункту гледжання музыкі: Траян бліскуча выканаў галоўную партыю ў пастаноўцы «Тыль Уленшпігель» на музыку Яўгена Глебава.

З творамі беларускіх кампазітараў працягваў працаваць ужо як харэограф: паставіў спектаклі «Крылы памяці» на музыку У. Кандрусевіча, «Трыстан і Ізольда» Р. Вагнера, «Вітаўт» В. Кузняцова. Супрацоўніцтва з кампазітарам Вячаславам Кузняцовым працягваецца і цяпер: ужо ў бягучым сезоне анансавана прэм'ера балета «Настасся».

У якасці мастацкага кіраўніка балета Вялікага тэатра Беларусі Юрый Траян займаўся і аднаўленнем класікі, у тым ліку і спектакля «Лебядзінае возера».

Марыя АСІПЕНКА

Люстэрка тыдня:

свет

У Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь прайшло ўрачыстае адкрыццё выстаўкі «Майстры Манпарнаса з беларускіх мястэчак». Творы сусветна вядомых беларускіх мастакоў Парыжскай школы для экспазіцыі прадставілі прыватныя калекцыянеры, частку работ дэманструюць шырокаму колу ўпершыню. Выстаўка складаецца са 100 карцін розных жанраў, створаных у перыяд з 1915-га па 70-я гады XX стагоддзя ў розных тэхніках жывапісу і графікі. Наведвальнікі ўбачаць работы Марка Шагала, Шрага Царфіна, Восіпа Любіча, Восіпа Цадкіна, Роберта Геніна, Яўгена Зака, Міхаіла Кікоіна і Пінхуса Крэменя, пазнаёмяцца з рознымі кірункамі класічнага мадэрнізму XX стагоддзя — фавізмам, кубізмам, экспрэсіянізмам. Для тых, хто хоча ўдасканаліць веды ў гэтай сферы, арганізатары прапануюць унікальную адукацыйную праграму лекцый беларускіх і замежных даследчыкаў Парыжскай школы, а таксама цыкл дакументальных фільмаў пра мастакоў.

Ізноў беларускі тэатр выправіўся за мяжу, каб пазнаёміць еўрапейскага гледача з айчыннымі набыткамі. Гэтым разам вядучыя салісты Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі з 20 верасня па 8 кастрычніка выступаюць на гастролях у Францыі. Найбуйнейшыя тэатральныя пляцоўкі Францыі — у гарадах Рэн, Анджэ і Нант — на пачатку новых сезонаў прымуць на сваёй сцэне рускія оперы «Алека» Сяргея Рахманінава і «Іаланта» Пятра Чайкоўскага. З арыямі ў бессмяротных операх да замежнага гледача выходзяць народныя артысты Беларусі Настасся Масквіна і Уладзімір Пятроў, заслужаныя артысты Андрэй Валенцій і Уладзімір Громаў, лаўрэаты міжнародных конкурсаў Ірына Кучынская, Наталля Акініна, Ілья Сільчукоў, Віктар Мендзелеў і Аляксандр Гелах. За дырыжорскім пультам сімфанічнага аркестра Брэтані — маэстра Андрэй Галанаў.

Юбілейная, 70-я, цырымонія ўручэння тэлевізійнай прэміі «Эмі» прайшла ў Лос-Анджэлесе (ЗША). Перамогу ў асноўнай намінацыі «Лепшы драматычны серыял» атрымаў фэнтэзійны серыял «Гульня тронаў». Ён выйшаў на экраны ў 2011 годзе, заваяваў галоўную ўзнагароду трэці раз і быў намінаваны на прэмію «Эмі» больш за 130 разоў. Заўважна, што сёлета цырымонію ўручэння «Эмі» ў тэлеэфіры глядзела рэкордна нізкая колькасць гледачоў: аўдыторыя скарацілася на 10,5 % у параўнанні з 2017 годам. Спецыялісты сцвярджаюць, што праблема — не ў зніжэнні глядацкай цікавасці. Справа ў тым, што ўсё часцей для прагляду абіраюць анлайн-трансляцыю ў інтэрнэце.

Дакументальны фільм брытанскага рэжысёра Стывена Іствуда «Востраў», прысвечаны апошнім дням жыцця пацыентаў хоспіса, дэманструе рэальную смерць чалавека. Рэжысёр меў задуму паказаць смерць як непазбежны і звычайны біялагічны працэс, і калі адзін з герояў фільма, пенсіянер Алан Хардзі, папрасіў зняць момант яго сыходу, Стывен Іствуд пагадзіўся. Іствуд кажа, што пацыенты імкнуліся расказаць пра свае пачуцці, каб справіцца са страхам перад канцом. Рэжысёр адзначае, што ўчынак Алана Хардзі — прыклад мужнасці і натуральнага стаўлення да смерці.

Агляд цікавінак ад Дар'і ЧАРНЯЎСКАЙ

ЛіМ КАЛЯНДАР

21 верасня — 100 гадоў з дня нараджэння Фёдара Янкоўскага (1918—1989), мовазнаўца, пісьменніка, заснавальніка беларускай фразеалогіі, заслужанага дзеяча навукі БССР.

21 верасня 70 гадоў святкуе Людміла Шлег, кампазітар.

21 верасня 60 гадоў спаўняецца Алегу Елісеенкаву, кампазітару.

22 верасня — 115 гадоў з дня нараджэння Хвядоса Шынклера (1903—1942), празаіка, паэта, крытыка.

23 верасня — 100 гадоў з дня нараджэння Аркадзя Маўзона (сапр. Арон Маўшэнзон) (1918—1977), драматурга.

23 верасня 80-гадовы юбілей адзначае Ганна Курыловіч, этнограф.

24 верасня — 125 гадоў з дня нараджэння Паўліны Мядзёлкі (1893—1974), дзеяча культуры, мемуарысткі, заслужанага дзеяча культуры БССР.

24 верасня 80 гадоў адзначае Барыс Нічкоў, музыкант-габаіст, педагог, заслужаны артыст БССР.

24 верасня 75 гадоў святкуе Яўген Кузняцоў, майстар манументальна-дэкаратыўнага мастацтва.

25 верасня — 105 гадоў з дня нараджэння Сяргея Грахоўскага (1913—2002), празаіка, паэта, перакладчыка, заслужанага работніка культуры БССР.

25 верасня — 100 гадоў з дня нараджэння Сямёна Лельчука (1918—1941), паэта.

25 верасня 80 гадоў спаўняецца Вячаславу Целешу, мастаку, краязнаўцу, філакартысту.

25 верасня 85-годдзе адзначае паэт Яўген Зялкоўскі.

26 верасня 65-гадовы юбілей адзначае паэтка Любоў Красеўская.

26 верасня — 115 гадоў з дня нараджэння Дзмітрыя Арлова (1903—1969), акцёра, рэжысёра, народнага артыста БССР.

27 верасня — 115 гадоў з дня нараджэння Веры Харужай (1903—1942), публіцыста, дзеяча рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, арганізатара патрыятычнага падполля ў Віцебску ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Ідзе падпіска на IV квартал 2018 г.

«ЛіМ»	1 месяц	падпісны індэкс
Для індывідуальных падпісчыкаў	5 р. 50 к.	63856
Ведамасная падпіска	15 р. 30 к.	638562
Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў	3 р. 80 к.	63815
Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі	11 р. 60 к.	63880

ГОРАЦКІ ПАРНАС

Літаратурны музей Максіма Гарэцкага ў Багацькаўцы.

Горад Горкі — адна з вядомых літаратурных мясцін на карце Беларусі. Сюды прыходзілі лісты ад Тараса Шаўчэнкі і Івана Тургенева, менавіта тут, на думку большасці даследчыкаў, Канстанцін Вераніцын пачаў пісаць знакамітую паэму «Тарас на Парнасе». Горацкі студэнт Павел Бахмецьеў быў прататыпам галоўнага героя рамана Мікалая Чарнышэўскага «Што рабіць?», а ў 1909—1913 гадах у каморніцка-агранамічным вучылішчы ў Горках вучыўся Максім Гарэцкі. У 1926—1928 гг. пісьменнік быў загадчыкам кафедры беларускай мовы, літаратуры і гісторыі і разам з Юркам Гаўруком ды Паўлінай Мядзёлкай знаёміў студэнтаў Горацкай сельгасакадэміі са здабыткамі беларускага прыгожага пісьменства.

Літаратурная гісторыя Горак на гэтым не заканчваецца, але менавіта юбілей Максіма Гарэцкага прадвызначыў маршрут чарговай літаратурнай вандроўкі, арганізаванай супрацоўнікамі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры: Мінск — Багацькаўка — Горкі. У Багацькаўцы пісьменнікі, навукоўцы, журналісты і супрацоўнікі музея наведалі Літаратурны музей Максіма Гарэцкага і ўсклалі кветкі на магілу бацькоў пісьменніка — Івана і Ефрасінні Гарэцкіх. Лагоднае вераснёвае сонца, ціхая вёска на шэсць двароў з вялікімі старасвецкімі хатамі, узнесеныя ў неба бярозы — такой застаецца Багацькаўка ў нашых успамінах.

Прэзентацыя дыска «Дыямант у пабітым шкле».

У Горках гасцей сустрэлі выкладчыкі і студэнты Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі. У бібліятэцы гэтай навучальнай установы адбылося некалькі міні-прэзентацый, галоўнай з якіх стала знаёмства з перасоўнай выстаўкай «Максім Гарэцкі. “Ахвярую сваім Я…”», прывезенай з Мінска. Выстаўка знаёміць з жыццёвым шляхам і творчай дзейнасцю выдатнага пісьменніка, на стэндах прадстаўлены ўнікальныя фотаздымкі. У найбліжэйшы час выстаўка будзе знаходзіцца ў Горках — наведаць яе плануюць не толькі студэнты, але і школьнікі.

Падчас сустрэчы адбылася першая прэзентацыя дыска «Дыямант у пабітым шкле» — аўдыякампазіцыі да 125-годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага. Першы дыск з творамі славутага пісьменніка — «На імперыялістычнай вайне» — быў выдадзены ў 2008 годзе. Над новым дыскам каманда працавала каля дзесяці гадоў. Распавялі аб праекце акцёр, радыёрэжысёр Алег Вінярскі і выдавец, журналіст Кастусь Антановіч.

— Візуальна мы ўяўляем нашых пісьменнікаў, але як яны могуць гучаць?.. Перадаць іх свет гукамі праз чытальніка, рэжысёра вельмі складана, — разважае Алег Вінярскі. — Мы хацелі, каб слухачы адчулі космас Гарэцкага і ціхую плынь яго расповеду. Таму своеасаблівай дамінантай новага дыска стала аповесць «Ціхая плынь» — гісторыя пра дзяцінства, пра першы досвед вайны. Словы з гэтага твора і далі назву праекту. У гэтым дыску мы засяродзіліся на вобразе інтэлігента, які хоча прысвяціць жыццё асветніцтву і культурнаму адраджэнню Бацькаўшчыны. І разам з творамі Максіма Гарэцкага змясцілі тры вершы Янкі Купалы і дзве песні Ефрасінні Міхайлаўны Гарэцкай у выкананні ўзорнага фальклорнага ансамбля «Калыханка».

Кіраўнік праекта Кастусь Антановіч звярнуў увагу на іншыя адметнасці аўдыякампазіцыі. Па-першае, слухачам прапаноўваецца малавядомы твор Максіма Гарэцкага — абразок «Старое замчышча», які друкаваўся толькі ў міжваеннай перыёдыцы, але мае канцэптуальнае значэнне ў творчасці пісьменніка. Па-другое, новы дыск — рэдкая магчымасць паслухаць беларускую класіку, пакладзеную на электронную музыку.

— Мы доўга разважалі, як праз музыку ўвасобіць ідэі гуманізму, касмічнай сувязі Максіма Гарэцкага з небам, прасторай, — і вырашылі звярнуцца да электроннай музыкі. Гэта пэўны эксперымент, бо беларускую літаратуру нячаста адлюстроўваюць праз электронную музыку, і нават для першай аўдыякнігі мы выкарысталі музыку класічную, — патлумачыў Кастусь Антановіч.

На сустрэчы былі прэзентаваны і кніжныя выданні, падрыхтаваныя да юбілею Максіма Гарэцкага. Паэт, галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Анатоль Шніп прадставіў кнігу «Вернасць высокім ідэалам», укладзеную разам з Гаўрылам Гарэцкім. Гісторык і краязнаўца Уладзімір Ліўшыц, які доўгі час узначальваў Горацкі гісторыка-этнаграфічны музей, расказаў аб працы над кнігай «Максім Гарэцкі: сцежкамі жыцця», якая была перавыдадзена сёлета ў Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі. Уладзімір Ліўшыц прапанаваў дадаць у школьную праграму творы Максіма Гарэцкага, якога амаль не вывучаюць у межах базавага курса беларускай літаратуры.

У Горках ёсць нямала мясцін, якія памятаюць крокі Максіма Гарэцкага. Гэта калідоры старых карпусоў, якія перажылі Вялікую Айчынную вайну, ліпавая алея, якая вядзе на горацкую гару Парнас, дзівосны батанічны сад, заснаваны ў 1836 годзе. Пасля заканчэння імпрэзы госці Горак прайшлі сцяжынамі Максіма Гарэцкага і агледзелі адметны беларускі горад, які засведчвае значнасць навуковых і культурных традыцый нашай краіны.

Юлія ШПАКОВА
Фота Лізаветы ДУБІНЧЫНАЙ

Будзем слухаць, што шэпча верас...

Паўліна Мядзёлка ў Маскве (сакавік 1969 г.).

Маё знаёмства з чароўнай Паўлінай Вінцэнтаўнай адбылося дзякуючы Дануце Бічэль.

Вясной 1969 года ў Маскве праходзіла 5-я Усесаюзная нарада маладых пісьменнікаў. І Данута Іванаўна запрасіла ў гасцініцу «Юность» да нас на сустрэчу МЯДЗЁЛКУ! Гэта былі незвычайныя хвіліны для размоў і фотаздымкаў на памяць — засталіся зафіксаванымі для гісторыі ўдумныя і ўсмешлівыя яе абліччы... А вось каля Паўліны Вінцэнтаўны на здымку (злева направа) — Данута Бічэль, Мікола Капыловіч, Мар’ян Дукса, Яўгенія Янішчыц, Варлен Бечык, Анатоль Кудравец.

З Масквы я памчаў у Рыгу. У Юрмале знайшлі жытло мае бацькі. З дапамогай латышоў-сабрысаў і навукоўцы Мірдзы Абалы пачаў вышукваць архіўныя звесткі пра педагагічную і артыстычную дзейнасць у Латвіі Паўліны Мядзёлкі. У 2003 годзе «Беларускі кнігазбор» выдаў кнігу «Крывіцкія руны: Беларускія пісьменнікі Латвіі» (укладанне і прадмова Сяргея Панізніка). Яшчэ ў 1908 г. Паўліна Мядзёлка пасялілася на некаторы час у Рызе. Таму і прысутнічаюць яе «руны» ў зборніку: мой артыкул, урывак з успамінаў Надзеі Мікалаевай-Комісар і самой Мядзёлкі «Сцежкамі жыцця». На старонках 198—199 — і яе песня-гімн «Пад гоман вясёлы».

Сустрэўся я ў Рызе і з Надзеяй Мікалаевай-Комісар — выхаванкай Мядзёлкі, тагачаснай выкладчыцы Дзвінскай дзяржаўнай беларускай гімназіі. Ёсць партрэт купалаўскай Паўлінкі работы рыжскага мастака Пётры Мірановіча, захаваўся і здымак артысткі Надзеі перад чарговым выступленнем... Доўгая гутарка з ёй — у запісах «Зязюлька. Успаміны Надзеі Мікалаевай-Комісар». Поўнасцю яны змешчаны ў кнізе «Крывіцкія руны. Выпуск 2. Беларускі культурны мацярык.»

А ролю Паўлінкі ў спектаклі паводле камедыі Янкі Купалы выконвалі, як мне хвалілася пры сустрэчы, і Анастасія Крэйц, і яе сястра Варвара Вашкевіч (у спектаклях сёстры выступалі пад прозвішчам сваёй мамы). Рух Паўлінкі па ўсёй Латвіі паказаны мною ў артыкуле «Глядзіце сонцу ў вочы». Ёсць згадка пра 125-гадовы юбілей П. Мядзёлкі і ў падрыхтаваным мною календары: «Памятныя даты 2018 года».

Сяргей ПАНІЗНІК, фота аўтара

P. S. XVI Архіўныя чытанні да 125-годдзя артысткі, педагога, мемуарысткі, заслужанага дзеяча культуры Беларусі Паўліны Мядзёлкі (1892—1974) адбудуцца 4 кастрычніка ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва ў Мінску.

«ЗНАЙСЦІ Ў САБЕ СЯБЕ САМОГА»

(думкі пра паэзію)

Паэзія і ёсць тая самая рэч, дзе ўсё падпарадкавана пошуку. Яна нават не прапануе, а загадвае: «Ідзіце і шукайце!» А дзе ж шукаць? Найперш за ўсё — у сабе самім, чаго і дамагаўся вялікі А. Твардоўскі і чые словы я вынес у загаловак.

У паэзію кожны прыходзіць сваім шляхам, але заўсёды праз таямніцу, разгадваючы яе, блытаючыся, расчароўваючыся, шмат разоў перакрэсліваючы ўсё, а таямніца і пасля адыходу паэта так і застаецца таямніцай. Але шукаць разгадку варта і трэба.

Даўно, яшчэ на самым пачатку, прамовілася: «Я з пушчы». Так і верш назваўся. Так і кніга. Але ў паэзіі нешта толькі прамаўляць — вельмі мала. Трэба жыць гэтым прамоўленым. Я і жыву. А таму і пушча жыве ў кожным маім вершы, пра што б ні пісалася. Нават калі гэта будзе самае найдалікатнейшае, скажам, тое ж каханне. А таму я сваю каханую запрашу не ў нейкую там сучасную кавярню, а туды, у пушчанскія сховы, дзе будзе і зялёна, і спеўна, і сумна, і першародна. З усіх нашых паэтаў я, напэўна, самы лясны. Толькі таму «хоць рос я, гледзячы на лес, а вырас, лес шануючы». Шаную яго, малюся на яго і за яго плачу, бо часта бачу, як не шкадуюць яго самі леснікі. Гэта не пахвальба. Памятаю, як некалі таленавіты Міхась Стральцоў (а мы з ім працавалі ў адным аддзеле часопіса «Полымя»), зусім не расхвальваючы маіх вершаў, казаў мне: «Падабаецца мне твая вернасць пушчы». І гэтага было дастаткова, каб сцвярджаць сабе і іншым тую вернасць. І сёння дастаткова. І слова «карані» для мяне значыць ой як шмат! Я нарадзіўся ў былым Івянецкім (цяпер Стаўбцоўскім) раёне, у самым пачатку Налібоцкай пушчы. Мая малая радзіма, мая малая вёсачка так і называецца — Малыя Навікі. Тут, у самой назве, столькі месца для жарту: «Ці будзеш паэтам вялікім, калі ты з Малых Навікоў!..» Яшчэ да з'яўлення на гэты свет край наш называлі панскай Польшчай. Але калі я аднойчы на гэты свет з'явіўся, ніякіх паноў тут і заваду не было. Але быў панскі маёнтак. Панскія пакоі нам аддалі пад школу. Так і называлі нашу школу — пакоямі. Меўся на ўвазе пад гэтым увесь будынак. На палац ён, магчыма, не цягнуў, але быў увесь белы, як цукар. Дождж часу потым змые яго белізну, але пакіне ў памяці светлы ўспамін пра далёкае дзяцінства, дзе і пачыналася тая самая паэзія.

Ад былога палаца засталіся толькі шэрыя сцены ды старая лістоўніца. Я часта прыходжу да гэтых сцен, прыхіляюся да старога зморшчыстага ствала лістоўніцы, і з кроны яе, як і тады ў дзяцінстве, сцякае за каўнер лагодны дожджык добрых згадак, сумнага, светлага і незваротнага. Пад струмені выціраеш на вачах і слязу. Так шмат светлага, белага і чыстага змыта бязлітаснымі дажджамі часу!

Часу можна ўсё даравацъ. Можна шмат чаго даравацъ і паэту, які ў старасці любіць выціснуць з сябе сентыментальную слязу. Нельга толькі даравацъ раўнадушша, якое ад чытача ніколі не схаваеш. Там, дзе вакол шмат абыякавасці, чэрствасці, неахайнасці, звычайнага хамства, паэт павінен падаваць свой голас першым, а не быць нейкім пабочным сузіральнікам. Вядома, крок першапраходцы заўсёды цяжкі і адказны, часам нават рызыкоўны. Але паэзія здольная на ўсё, на што здольны сам чалавек.

Добра, што паэзія не здае сваіх вышынь, заваяваных яшчэ нашымі папярэднікамі. Два пакаленні вялікіх паэтаў, два паэтычныя выраі прамільгнулі перад маімі вачыма. Першыя прайшлі праз цяжкія выпрабаванні вайны, праз шэрыя засценкі ГУЛАГа, другія падалі свой трубагучны голас ужо ў часы славутай хрушчоўскай адлігі. Да гэтага, другога, выраю далучыліся і мы, крыху маладзейшыя за іх.

Ледзь не ўсё жыццё блукае са мной па дарогах і прыстанішчах адна вельмі дарагая для мяне кніга. Гэта першая айчынная анталогія паэзіі («Беларуская савецкая паэзія»). Яна выдадзена ў 1949 годзе, а ў рукі мне трапіла недзе ў пачатку пяцідзясятых. Я назаўсёды «пазычыў» яе ў сваёй цёткі Ванды, першай астраўской пасляваеннай бібліятэкаркі. Добра пацерліся, набраліся змрочнасці моцна пераплеценыя цвёрдыя вокладкі, пажоўклі, як восеньскі ліст, старонкі, а кніга жывая, чытэльная і дарагая. Церлася яна і ў маёй вучнёўскай сумцы, і лёгка гарталася ў студэнцкім інтэрнацкім пакойчыку на Свярдлова, дзяліла са мной армейскія будні ў ваенных гарнізонах Падмаскоўя, пераязджала з кватэры на кватэру ў Мінску і нідзе ні разу не згубілася. Ёй вельмі цёпла са мной там, у роднай бацькоўскай хаце. Адгарну яе першую вокладку. А там алоўкам выведзеныя нейкія няўпэўненыя радкі пра даўнія вясковыя будні. Паперы тады бракавала, і першыя свае паэтычныя практыкаванні я тварыў пад сховамі школьных

падручнікаў ды іншых кніг. Я часта гартаю гэты мой жыццёва-дарожны паэтычны «дапаможнік», дзе шчыра ўсміхаюцца мне з маладых фотаздымкаў і Аркадзь Куляшоў, і Пімен Панчанка, і Анатоль Вялюгін. У ваенным кіцелі прыўсміхаецца капітан Пятро Прыходзька. І падае голас усмешлівы Адам Русак з яго песняй «Бывайце здаровы». Першыя два галоўныя месцы адведзены песнярам Янку Купалу і Якубу Коласу. У большасці вершаў гучыць тое сталёвае слова «Сталін», ад якога яны потым будуць настойліва пазбаўляцца, там, дзе можна, замяняючы яго на слова «Партыя». «Быў час, быў век, была эпоха», — сцвярджае ананімны паэтычны летапісец. Але і была паэзія. Залатыя драбніцы яе так шчодра рассыпаны па кнізе. Мабыць, я сам надзяліў чымсьці магічным гэту старую кнігу, бо калі бывае самотна на душы, калі не пішуцца вершы, я звяртаюся толькі да яе, і дапамагае.

Сённяшнія маладзейшыя за мяне, і мала мала-дзейшыя, і добра маладзейшыя, рэдка згадваюць іх, добрыя два пакаленні і цікавых, і таленавітых, і розных паэтаў, творчасць якіх прыпала і на вайну, і больш як на чатыры пасляваенныя дзесяцігоддзі. А там якія імёны! Во ў каго трэба вучыцца! А ў паэзіі, як і наогул у жыцці і ў любой творчасці, без вучобы, без шчырага ўдзелу настаўніцтва, відаць, немагчыма. Няма ў нас пакуль што паэтычных акадэмій, хоць з'яўляюцца ўжо нейкія паэтычныя тэатры, няма звання дактароў і кандыдатаў паэтычных навук, але ёсць вялікія імёны. Перад імі я нізка схіляю галаву, у іх мушу вучыцца. Нездарма ж калісьці таленавіты і патрабавальны Я. Вінакураў усклікнуў: «Художник. Научи ученика, что б было у кого потом учиться!»

Калі размова заходзіць пра паэзію, ёсць такая патрэба душы: заўсёды хочацца вярнуцца ў сваю маладосць. Да самага пачатку. У маладыя гады я сапраўды меў нейкія паэтычныя крылы, што рэдка адчуваю сёння. Бо шмат было тых, хто пазычаў сілы для ўзлёту. Той жа Алег Лойка з нашага ўніверсітэта, які так і назваў літаб'яднанне — «Узлёт». Узляталі! І яшчэ як дружна. А Іван Калеснік з «Чырвонай змены», якога згадвалі ўдзячна многія, у тым ліку Васіль Быкаў, Рыгор Барадулін, Уладзімір Паўлаў. Сам І. Калеснік пісаў мала і даволі цяжка. А іншых вельмі шчыра падтрымліваў. Руку падтрымкі падалі мне ў маладосці два вялікія майстры слова — Анатоль Вялюгін і Мікола Аўрамчык. Дзякуй ім за гэта!

Толькі аднаго вопыту ў літаратуры малавата. Трэба мець заўсёды свежае, абвостранае адчуванне часу. Узрост часам тут не лепшы дарадчык. Ну а маладзейшым хацелася б пажадаць большай заземленасці. Тым, хто спрабуе адарвацца ад зямлі, сягнуць за айчынныя далягляды, варта памятаць, што вяртацца на зямлю ўсё ж некалі давядзецца. Няважна, якім чынам. Не чужое, запазычанае, але пасаджанае ў нашу глебу дадае нам нашасці, — толькі сваё роднае, сакаўное ды караністае. Трэба заўсёды памятаць і пра наш багаты фольклор. Колькі разоў паэзія ўцякала ад яго і зноў туды ж вярталася. Бо там жа вытокі. Добра, што паэзія не здае сваіх вышыняў, як я ўжо казаў раней. Шкада, што цяжкавата заваёўвае новыя. Радасна, што ў ёй па-ранейшаму вельмі плённа твораць такія паэты, як Мікола Маляўка, Мар'ян Дукса, Уладзімір Скарынкін, Валянціна Паліканіна, Ганад Чаркасян, Алесь Бадак, Мікола Мятліцкі, Віктар Шніп. Спіс можна доўжыць. З маладзейшых хачу назваць Ірыну Дубашынскую, Кацярыну Масэ, Максіма Кішчанку, Алену Карасёву. Магчыма, самыя галоўныя вышыні яшчэ наперадзе.

Зноў вяртаючыся да сваіх родных мясцін, хачу засведчыць, што чалавеку, народжанаму ў вёсцы, у ёй, малой, заўсёды ўтульней, чым у вялікім і шумлівым горадзе, куды мы заўсёды так імкнёмся, куды рваўся некалі і я. А калі ехаў нядаўна ў Іванава на юбілейнае свята нашага пісьменства, напісаліся такія радкі:

Як маці родная, яна адна,
На свет вачыма яе глядзім мы.
Вучыць, турбуе, шануе нас
Яе вялікасць МАЛАЯ РАДЗІМА.

Я часта думаю пра сваё пушчанскае паходжанне. Калі і забраць у мяне ўсё гэта пушчанскае, усё адно буду спяваць голасам пушчы, бо яна прарасла праз мяне сваімі птушкамі і дрэвамі, сцяжынамі і гушчарамі, і я прарос праз яе сваімі думкамі. І самыя вясёлыя, і самыя сумныя акорды жыцця мне даводзілася чуць толькі тут, у пушчы.

Часам я кажу сам сабе: «Свет вялікі, а Малыя Навікі малыя. Але малыя яны толькі ў параўнанні з вялікім светам». Усё вялікае вырастае з малога. Гэта заўсёды варта памятаць. І ўсё маё творчае кожнай жылкай знітавана з родным пушчанскім куточкам. Не трэба забывацца, што ў маленькай вёсачцы жывуць людзі, якія прапісаны сэрцам да вялікай краіны. А яна, Беларусь, не такая ўжо і малая. Толькі адна Налібоцкая пушча мае плошчу каля 140 тысяч гектараў. А з пушчаў у нас не яна адна.

Паэты любяць параўнанні. Некалі і Беларусь параўноўвалі то з дубовым, то з кляновым лістком, то з выявай белавежскага зубра. У кожнага паэта сваё асабістае ўяўленне. Цяжка параўноўваць краіну з чымсьці, калі яна сама сабе — найлепшае параўнанне. А гэта значыць — яна непаўторная. Яе дарагі абрыс добра акрэслены ліловым пяром маланкі — самы лепшы малюнак нашай непаўторнасці і вечнасці. Відаць, і паэту нялішне будзе памятаць, што ў жыцці мудрэйшага за само жыццё нічога не бывае, бо яно створана па сваім мудрым чарцяжы самым наймудрэйшым Творцам.

Асутнасць самой творчай задачы паэта я сфармуляваў у тым самым кароткім вершы, які ўключаны ў кнігу «Высокі бераг»:

Шукаць у кветак залаты нектар
І спелай ягадцы глядзець у твар,
Травінкай ціха вусны саладзіць,
Лавіць пылінак залатую ніць,
І чуць, што ўсім, як і табе, баліць…
І хопіць. Дастаткова. Бо ўсё гэта
Каштуе многа —
Сутнасці паэта!..

Казімір КАМЕЙША

«Простыя словы, простыя рэчы», і чаму з іх трэба смяяцца?

(гумарыстычная рэцэнзія)

Здаецца, гумар існуе паўсюль. Самыя рэйтынгавыя перадачы і серыялы на тэлебачанні гумарыстычныя, большая частка кантэнту ў сацыяльных сетках — смешныя гісторыі ці карцінкі. Смешная рэклама хутчэй запамінаецца. Нават у газетах (дзякуй богу, не ў гэтай) ёсць дзіўная рубрыка з анекдотамі. Тое, што не наўпрост смешнае, — іранічнае ці сатырычнае. Цесная сувязь попыту і прапановы ні для кога не таямніца, але, гледзячы на некаторыя з гэтых «прапаноў», задаешся пытаннем: «Гэта сапраўды смешна?»

Як павінна быць, каб было смешна, — пытанне без пэўнага адказу. Але стваральнікі кніжнай серыі «Несур'ёзна пра сур'ёзнае» вырашылі, што смешна тое, што найбольш падобна да жыцця. Прынамсі, такое ўражанне ствараюць дзве свежыя (абедзве падпісаныя ў друк у чэрвені гэтага года) кнігі, што пабачылі свет у выдавецтве «Чатыры чвэрці» з гэтай серыі — зборнік вершаў «Цярністы мой шлях!..» Аляксандра Мартыненкі і зборнік апавяданняў «Матрошкі з малаткамі» Васіля Найдзіна. Абедзве вокладкі жыццярадасна афармлены карцінамі Валянціна Губарава і вуглаватым шрыфтам, што павінна настройваць на гумарыстычны змест побытавага характару — чытво лёгкае і цікавае.

«Матрошкі з малаткамі» прапануюць нам тое, чаго ў жыцці і так хапае, — размовы. У асноўным, гэтыя апавяданні змяшчаюць дыялогі калег, сяброў, сваякоў, аўтара з рэдактарам, часам, праўда, унутраны маналог героя або змест ліста. Тэмы гэтых размоў максімальна набліжаюць аўтара да чытача, бо знаёмыя кожнаму: адносіны з жанчынамі, сваякамі, калегамі, праблемы на працы. І нельга сказаць, што сітуацыі, якія абмяркоўваюцца, асаблівыя ці новыя. Напрыклад, мужчына спазніўся на працу і піша вельмі літаратурную тлумачальную. Або мужчына хацеў падгледзець за жанчынамі ў лазні і яму нечым тыркнулі ў вока. Здаецца, даўно прыдуманы фармат сітуацыйных камедый такія сюжэтныя схемы выкарыстоўвае даволі часта. Добра, калі сюжэт можна згарнуць да кароткай формулы, бо з такімі апавяданнямі гэта часам неяк не працуе.

У апавяданні В. Найдзіна «Матрошкі з малаткамі», якое і дало назву зборніку, дырэктар ды намеснік дырэктара размаўляюць пра адпачынак, праблемы свайго бізнесу, недысцыплінаваных падначаленых, пра тое, што жонка аднаго з іх ходзіць у кіно з бухгалтарам, і шмат пра што яшчэ, пераскокваюць з аднаго на другое, на трэцяе, вяртаюцца да першага і абсалютна заблытваюць чытача ў плыні сваёй размовы. Праз гэта апавяданне падаецца зацягнутым, а карціна, якую яно дробнымі штрыхамі выбудоўвае, — карыкатурай. Магчыма, менавіта на карыкатурны паказ рэчаіснасці такая стылістыка і накіраваная, але яна ўсё ж такі абцяжарвае ўспрыманне.

Каб падкрэсліць карыкатурнасць персанажаў, аўтар надзяляе іх памяншальна-ласкальнымі прозвішчамі: Лапушкін, Мякішкін, Кацюлькін, Булачкін... Зборнік падзяляецца на дзве часткі, напэўна, з задумай аддзяліць сатыру ад гумару, але яскравага адрознення паміж творамі не заўважаецца. Апавяданні з гэтай кнігі нагадваюць тыя самыя анекдоты з газет, якія разрасліся ў гісторыі з жыцця. Такі сюжэтны ход, дарэчы, таксама прысутнічае ў некалькіх апавяданнях («З каго смяёмся?», «Анекдот»).

Звернемся да вершаў.

«Цярністы шлях» Аляксандра Мартыненкі падзяляецца на тры часткі. Першая прысвечана жыццю на лецішчы, агароду, суседзям — яны, дарэчы, даволі канкрэтныя персанажы, якія пераходзяць з верша ў верш. Другая частка засяроджана на кашэчых матывах: аўтара альбо раздражняюць каты, альбо ён размаўляе са сваім катом, альбо асацыіруе сябе з катом. Але і тут сустракаюцца апісанні жыццёвых сітуацый, накшталт «начальнік ЖКГ паслізнуўся ў галалёдзіцу» ці «шукаў натхненне ў кавалку сала». Трэцяя частка — экзістэнцыяльныя роздумы пра месца чалавека ў жыцці, сэнс існавання, прызнанне паэта (некалькі вершаў пра помнік) і гэтак далей. Хаця і тут не абышлося без побытавых показак.

Асноўныя тэмы такія ж простыя-знаёмыя чытачу, як і ў кнізе прозы, толькі, здаецца, з лягчэйшым стаўленнем да жыцця. Оды ляноце, вершы пра ежу ды гарэлку, пра заляцанні да суседак. Тут ёсць нават пародыя на верш Пастарнака «Зімовая ноч», толькі пра бліны.

Але ў апошняй частцы зборніка вектар рэзка змяняецца. Замест суседкі Раіскі пастаянным персанажам становіцца Муза (менавіта з вялікай літары), а аўтар пачынае філасофстваваць пра тое, як трэба жыць і што будзе потым. Такі рэзкі пераход, напэўна, павінен ахарактарызаваць аўтара як рознабаковую асобу і застаецца на сумленні ўкладальніка (яго радкі некалькі разоў з'яўляліся эпіграфамі да вершаў зборніка).

Нават калі не звяртаць увагі на «кровь — любовь», «весна — от сна», «мгновенье — вдохновенье», бясконцыя дзеяслоўныя рыфмы, атрымліваецца, што ўсе вершы — альбо бытапісанне, альбо рэфлексія (альбо разам). Можа, не варта так крытычна ставіцца да гумарыстычных па задуме твораў? Можа, і не варта было, калі б не апошняя частка, у якой аўтар неаднаразова адзначыў: «Я паэт, я хачу, каб мяне запомнілі».

Такія кнігі прыводзяць чытача, хаця б крыху абазнанага ў паэзіі, да вялікіх роздумаў пра яе прыроду і прызначэнне. Але варта адзначыць, што на смех ад гэтых твораў усё ж такі «прабівае»!

Ці адпавядаюць разгледжаныя кнігі заяўленаму ў назве серыі «несур'ёзна пра сур'ёзнае»? Усё прачытанае можна абагульніць так: зрэз жыццёвых сітуацый, побытавых здарэнняў, спроба паглядзець на свет, людзей і сябе самога з іншага боку, быццам аддалена. Так лягчэй разабрацца, што вартае смеху, а што — наадварот.

Засталося апошняе пытанне. Што ў гэтай рэцэнзіі такога гумарыстычнага? Тое ж самае, што і ў разгледжаных кнігах.

Дар'я СМІРНОВА

ПЕРАД ЧЫТАЧОМ — ЯК ПЕРАД БОГАМ

Спавядальная проза — жанр небяспечны, бо можа пісьменніка як узвысіць і выклікаць небывалую цікавасць з боку чытача, давер і любоў, так і знішчыць, загнаўшы ў своеасаблівую пастку: усё залежыць ад шчырасці. Аднак жанр і найцікавейшы, асабліва калі твор напісаны таленавіта і дыхае сапраўдным жыццём, а не сурагатам магчымага жыцця. Узорам падобнай прозы можна лічыць непаўторныя раманы, насычаныя неверагоднай сілай агалення душы, — Генры Мілера, Чарльза Букоўскі, Джэка Керуака. Вартыя ўвагі таксама «Трынаццаць дзён з дзённіка Антона Кудлатага» Анатоля Кудласевіча, у якіх з непасрэднай шчырасцю аўтар засяроджвае ўвагу не толькі на сабе і падзеях, што датычацца, здаецца, толькі яго, але і дзеліцца неацэннымі, найкаштоўнейшымі звесткамі пра жыццё Анатоля Сыса ў 1990-я гады.

«Час жніва і час пакаяння» Наталіі Касцючэнкі («Мастацкая літаратура», 2018), аповесць-эсэ ў аўтарскім перакладзе, па вызначэнні самой пісьменніцы, — з шэрагу менавіта спавядальнай прозы. Твор пісаўся на працягу дзесяці гадоў і, па ўсім відаць, каштаваў аўтарцы немалых высілкаў. Бо, каб спавядацца перад чытачом як перад Богам, трэба мець не абы-якую мужнасць, тым больш жанчыне. Тым больш жанчыне, якая мела паспяховы бізнес, звязаны з фітадызайнам, пра што даведваемся са старонак аповесці. Але прага да слова, беларускага слова, і жаданне яшчэ з юнацкіх гадоў быць пісьменніцай перамагаюць у рэшце рэшт усе «за» і «супраць». І гэта подзвіг, сапраўдны подзвіг па сённяшніх часах, — быць беларускай пісьменніцай. Як і напісанне вышэйназванай аповесці — таксама подзвіг.

Твор падзелены на асобныя, вытрыманыя ў адмысловых часавых прамежках, часткі, у якіх Наталія нібыта намагаецца растлумачыць, у першую чаргу самой сабе, чаму ўсё склалася не так, як марылася ў дзяцінстве, і свой доўгі шлях да таго моманту, калі з годнасцю змагла назваць сябе пісьменніцай, нікога не саромеючыся і не зважаючы на незадаволенасць сваякоў.

Спачатку мы бачым яе пяцігадовай дзяўчынкай, маўклівай і ўразлівай, якая бачыць неверагодныя сны, што будуць пераследваць яе ці не ўсё жыццё і трывожыць прароцкімі вобразамі. Яна жыве ў вёсцы побач з украінскай мяжой разам з бабуляй і не вельмі хоча жыць у горадзе. Нават збягае ад бацькоў, калі тыя прыязджаюць па дачку, бо ў школу мусяць яе аддаць гарадскую. Сцэны, дзе згадваецца Украіна, прасякнуты непрыхаванымі болем і тугой, бо неўзабаве выбухне атамны рэактар у Чарнобылі, чад ад якога накрые і бабуліну вёску.

У горадзе Наталія вучыцца ў школе, потым паступае на сельскагаспадарчы факультэт тэхналагічнага інстытута, бо на філфак ці журфак забараняе бацька — неаспрэчны аўтарытэт — фізік…

І тады…

Найбольш шчымлівай, прасякнутай шчырым пачуццём і жалем, але ні ў якім разе не шкадаваннем, з'яўляецца неверагодная частка пра каханне пад назвай «Здрада». У першым жа сказе Наталія прызнаецца, што да гэтага пра каханне ніколі не пісала, і ёй верыш, верыш да апошняга слова, бо яна распавядае, нічога не ўтойваючы і не шкадуючы сябе, менавіта сябе, пра адносіны са сваімі трыма мужчынамі, двое з якіх пасля сталі яе мужамі, але кахала яна першага. Усе яны былі вельмі розныя. Адзін, як сёння модна казаць, шыкоўны брутал, другі — эгаістычны прыстасаванец, зацыклены адно на сабе, трэці — ціхмяны і рахманы, больш падобны на сына, чым на мужа. Дарэчы, другі мужчына, але першы муж, за якога Наталія выйшла замуж пад уздзеяннем бацькоў, няздатны аформіць уласныя думкі ў напісаныя словы, выкарыстоўвае пісьменніцкі талент жонкі ў асабістых мэтах. Яна піша за яго навуковыя і публіцыстычныя артыкулы, а ён падпісвае пад імі сваё імя, упэўнены, што Наталія ніколі пад сваім іменем не надрукуецца, бо хто яна, а хто ён. Падобнае, між іншым, ужо здаралася, напрыклад, у сям'і вялікага амерыканскага пісьменніка Фрэнсіса Скота Фіцджэральда, які напісаныя жонкай Зельдай апавяданні публікаваў пад сваім іменем і нават выкарыстаў яе дзённік як падмурак для некалькіх сваіх раманаў. Ён не сумняваўся ва ўласным таленце і ў падобных учынках не бачыў нічога крымінальнага. Як скончыла Зельда — усім вядома. Наталіі пашанцавала больш.

Споведзь ліецца далей як рака, яе не спыніць. Калі пераадолены і размыты берагі ўласнага эга — лягчэй прызнавацца ў памылках, прабачацца перад тымі, хто не варты твайго дараванння, нема крычаць аб стратах блізкіх, якіх не вернеш ніколі, але з надзеяй пазіраць у будучыню, бо, па праўдзе кажучы, усё яшчэ наперадзе. Жыццё — аптымістычная трагедыя, аднак такое цікавае!..

Пяць апавяданняў, дапасаваных да аповесці, напісаныя сакавітай мовай, як бы працягваюць Наталліну споведзь, ды ўжо не пра сябе, а пра тых, хто назаўсёды застаўся толькі ў памяці, бо адных накрыла Чарнобылем, другіх — злая сіла несправядлівасці, а трэціх — нябачнае прасцірадла любові да жыцця, чалавецтва, зямлі.

Мікола АДАМ

НЕБЯСПЕЧНАЕ ПАДАРОЖЖА НА ТРАМВАЙНЫМ КОЛЕ

Сёння, калі магчымасці для шырокага літаратурнага развіцця, з'яўлення новых цікавых твораў, выдання новых кніг і часопісаў, узнікнення яркіх культурніцкіх спрэчак ды інтэлектуальных дыскусій куды большыя, чым раней, за савецкім часам, жывеш у заўсёдным падманліва-марным чаканні нечага новага і творча-змястоўнага.

Бо калі што адметнае і з'яўляецца, дык хутка знікае, пераможанае ў агульным самазадаволена-інертным, застыглым культурніцкім бытаванні.

Пытанне стылю, формы, артыстызму мовы, танцавальнай гнуткасці фразы мае звыкла другаснае значэнне для большасці айчынных пісьменнікаў, яно па сёння застаецца адкрытым і, пры ўсёй спробе асобных літаратараў розных пакаленняў у ранейшыя гады яго вырашыць, патанала ў багне масавага раздражнення сваіх калег.

Адна са спроб такой дыскусіі ўзнікла на старонках «Літаратуры і мастацтва» амаль трыццаць гадоў таму.

1.

У пятніцу, 17 ліпеня 1987 года, у 29-м нумары, з'явіўся артыкул Леаніда Дранько-Майсюка «"Як" і "Навошта"?» Паэт пісаў: «Мы падменьвалі мастацкае пісьмо дыпламатычным і ўсё рабілі дзеля таго, каб яму, без'языкаму пісьму, не сустрэлася ніякай перашкоды. Мы аддавалі мала ўвагі такой драбязе, як мастакоўская годнасць». Дранько-Майсюк засмучаўся, бо «мы, сучасныя мастакі, не стварылі /.../ эмацыянальна-горкіх старонак, бо мы баяліся шчыра пісаць "для сябе", мы заўсёды дыпламатычна пісалі "для народа"». Паэт рабіў рызыкоўныя закіды класікам: «Пытанне формы канчаткова не вырашана ў творчасці Вячаслава Адамчыка, аўтара таленавітых, але кампазіцыйна досыць арытмічных раманаў /.../ . ...раман Івана Пташнікава "Алімпіяда" /.../ нібы знарок нечытэльны. Звышпадрабязныя апісанні /.../ выклікаюць амаль фізіялагічнае ўражанне перанасычанасці. /.../ Гонячы лістаж, заварожаныя культам "надзённага" зместу, мы забыліся, што мастацтва павінна заставацца мастацтвам. Для нас сталася нікчэмнасцю і драбязой гаворка пра хараставо радка, пра завершанасць страфы, пра музычнасць і рытм прозы».

Па словах аўтара, многія пасля той ліпеньскай публікацыі «проста ў вочы называлі [мяне] дурнем. /.../ на хаду аналізавалі, /.../ нават аргументавана аспрэчвалі пэўныя мае вывады» (Леанід Дранько-Майсюк. Вінаваты мы самі // Літаратура і мастацтва. Пятніца, 22 красавіка 1988 г. № 17).

Паэта здзівіла «амаль поўнае маўчанне /.../ літаратурных аднагодкаў /.../ Хрысціны Лялько, Алеся Пісьмянкова, Уладзіміра Ягодзіўка, Ірыны Багдановіч...» (там жа).

Але нечаканая падтрымка прыйшла з-за акіяну: «Усё ж трымаюся погляду, што эстэтычны ўзровень нашай літаратуры яшчэ нізкі. Нездарма Дранько-Майсюк узнімаў занядбанае ў нас пытанне формы, адвечнае пытанне формы, адвечнае пытанне — што і як. І як накінуліся на яго! А дарэмна. Нашаму брату не зашкодзілі б салідныя курсы па эстэтыцы».

Чалавека, які быў аўтарам гэтых радкоў, звалі Масей Сяднёў.

Амаль 80-гадовы паэт-эмігрант, які апынуўся ў сталінскіх лагерах з-за даносу аднакурсніка, лічыўся ворагам савецкага ладу, а на эміграцыі, наадварот, быў абвінавачаны ў прасавецкіх настроях, выдатна разумеў, што гэта такое, калі абураная большасць уздымаецца на аднаго.

Сяднёў пашкадаваў маладога калегу, але, акрамя такога чыста бацькоўскага шкадавання, быў усцешаны, што пачуў сугучнае сваім развагам.

2.

Гэтых, вонкава вельмі непадобных адзін на аднаго, паэтаў шмат што яднала.

За некалькі гадоў да перабудовы, у 1983 г., Леанід Дранько-Майсюк піша кінематаграфічна-імклівую паэму «Кола»: «Цяжкое трамвайнае кола / З прасторы базарна-зялёнай / Паўз яткі, харчэўні і школы / Ляцела па Менску шалёна. / Забыліся дрогкія рэйкі / І ўпірлівы скрогат спынення. / Ляцела па лісці клейкім, / Па мармуры і каменні. / Палохала балаголаў / І нэпманаў каля крамак. / Па бруку, па гною кола / Сляпы вызначала напрамак /.../»

Паэт марыць (і мара гэтая дастаткова рызыкоўная), каб сонную прастору беларускага культурніцкага свету (няважна, ці гэта часы НЭПа ці андропаўска-чарненкаўскі перыяд) пратараніла, разбіла вар'яцкае, небяспечнае, анархічна-безразважлівае КОЛА, якое б скаланула, напалохала, абудзіла, разварушыла нашае заўсёдна-соннае царства літаратуры. Гэтае напорлівае і няўмольнае, як гнеў антычных багоў, кола ў сваім экстатычным танцы па целе Беларусі абавязкова каго-небудзь з найбольш упарта-апатычных прыдушыць, зруйнуе іх скамянелую свядомасць. Паэт хоча, каб на змену метафарычным «напалоханым нэпманам» ад літаратуры прыйшлі новыя Уладзіміры Дубоўкі, з'явіліся творча-свабодныя інтэлектуалы.

Пра гэта ж марыў і Масей Сяднёў.

За некалькі гадоў да хрушчоўскай адлігі ён складае верш «Абнаўленьне», у якім выказваўся, што яго сучаснікі вартыя толькі таго, каб яны: «...пякліся як-бы на агні, / зьвіваліся ўсе ад мучэньня. / Ні ў нізе і ні ў вышыні — / нідзе ня было каб збаўлення». Паэт заклікае: «Хутчэй — жа пагібель і мор, / сусьветнай прыходзь спусташэньне! / У вечнае йдзі на шырокі прастор, / другое людзей пакаленне!»

Масей Сяднёў быў рэалістам і не верыў у магчымасць адраджэння Радзімы сённяшнімі беларусамі. Бо калі нават Янка Купала (пра што неаднаразова з болем згадваў Сяднёў) са сваёй жонкай размаўляў па-польску, то пра якое сапраўднае, праўдзівае адраджэнне можа весціся гаворка?

І Масею Сяднёву, і Леаніду Дранько-Майсюку ў аднолькавай ступені далёкі псеўдапатрыятычны пафас, высокі стыль, атулены вышыванкістым дэкорам, за якім зазвычай хаваецца пустата зместу.

Аўтар паэмы «Кола» ўвогуле скептычна ставіцца да тэрміна «Адраджэнне»: «Само паняцце Адраджэння



самы час ураўнаважыць больш аб'ёмным паняццем — Нараджэнне, бо іншы раз мы спрабуем адрадзіць тое, што не адраджаецца, а калі адраджаецца, то набывае раптам незразумелы, а часам і непажаданы сэнс» (Леанід Дранько-Майсюк «...Натуральны, як лінія небасхілу», 2017).

У вершы «Сьмерць музыкі (Памяці Міколы Равенскага)» Масей Сяднёў з яшчэ большай, нават, сказаў бы, публіцыстычнай з'едлівасцю заяўляў: «Ня цяжка на сьцягох, і пышных і ўрачыстых, / Свабоду напісаць і незалежнасьць, цяжэй — пайсьці за гэта ўсё на бітву. / Мы славай упіваемся мінулай / і даўняе, як мару, ускрашаем, / а дзень сягоньняшні мінае без заваяваньняў» (Масей Сяднёў. Патушаныя зоры. 1975). Пра беларусаў выказваўся так: «Нібы дзеці забітых ваўчых, / не спазнаўшыся добра з гняздом, / па дарогах мы ходзім чужых / і ня знаем, дзе хата, наш дом» (верш «Крывічом»). А пра саму Беларусь з болем пісаў: «Другія славу сабе хутка лепяць, / а той папар ня ўзьнятым шчэ ляжыць. Было-б не нараджацца табе лепей, чым нарадзіўшыся, ня жыць, /.../ Сьпяць акіяны твайго воды, / як сон, варочаецца імгла, / Нашто-ж, скажы, між Захадам і Ўсходам / вачыма сінімі ты прарасла?» («Беларусь»).

3.

Абодва пісьменнікі з вялікай доляй скепсісу ставіліся да эміграцкай паэзіі.

Развагам Дранько-Майсюка, праўда, уласцівыя пэўныя спачувальныя ноткі: «Так, у гэтых літаратараў цяжкі лёс, яны прайшлі жахлівыя сталінскія лагеры, спазналі чэрствы хлеб эміграцыі, аднак жа не стварылі тыя мастацкія творы, якія былі б раўназначныя іхнім пакутам» (Леанід Дранько-Майсюк «...Натуральны, як лінія небасхілу», 2017).

У эмігранта Сяднёва ўсё гэта гучыць з куды большай жорсткасцю. Ён пісаў ліст Яну Чыквіну (21.07.1996), дзе даваў такія несуцяшальныя характарыстыкі калегам: «Алесь Салавей быў пераважна паэтам мэханістычным, у яго паэзіі няма адкрыцьця (...). Любіў карыстацца слоўнікам Ластоўскага, браў зь яго замыславатыя славечкі і ўводзіў іх у свае вершы, і тыя, абцяжараныя рэдкаўжываным лексыкай, камянелі, а не жылі. (...) Рыгор Крушына граў на бірульках. Паводле Шапэнгаўэра, першы прызнак бяздарнасьці — гэта гульня ў мастацкія бразготкі бяз унутранага сэнсу ў іх. (...) ...Ці была [вышыня] у Крушыны ці Кавыля? У іх не было ні вышыні, ні заняпаду — яны былі і ёсьць роўныя, у іх, калі хочаце, не было «разьвіцьця», у сэнсе нейкага апагея. У іх не было інтэнсіўнага паэтычнага існаваньня». (Гэта я ўжо, каб дабіць іх, бедных)» (Лісты Масея Сяднёва Яну Чыквіну // Тэрмапілы. 2013, № 17).

Не іграць «на бірульках», не быць аднастайна-роўнымі, дасягаць таго, каб у паэзіі было самае дарагое і каштоўнае, — АДКРЫЦЦЁ. Пра гэта дбалі на пачатку свайго творчага шляху з аднолькавым фанатызмам героі нашага артыкула.

У «Масеевай кнізе» (1994) Сяднёў цудоўна апісаў тое, як ён складаў свае вершы за які месяц да арышту, восенню 1936 года: «...я знаходзіўся ў нейкім трывожным прадчуванні. Маёй душой апанаваў глыбокі сум. /.../ Я цэлымі днямі сядзеў у бібліятэках горада і глядзеў, як працавалі другія. У маёй душы спелі вершы, якіх бы ніхто і ніколі ў той час не надрукаваў. Больш таго, прачытаць іх каму-небудзь было б вар'яцтвам».

Ну, праўда, што можна было сказаць пра маладога савецкага паэта Масея Сяднёва (яго да гэтага ў друку хваліла высокае літаратурнае начальства — Максім Клімковіч і Андрэй Александровіч), які свой новы верш пачынае з такой нечакана-нервовай ноты: «З-пад павеці певень белы, / узьляцеўшы, моцна крыкнуў. / Думку збіў ён ашалелы, / і цяпер на сэрцы прыкра...» І сапраўды, Сяднёву было вельмі крыўдна, калі, прачытаўшы некалькі такіх вершаў Аркадзю Куляшову, ён атрымаў ад яго параду, што «трэба лячыцца». Але за паэта нечакана ўступіўся пралетарскі празаік Платон Галавач. Магчыма, аўтар цудоўнай аповесці «Спалох на загонах» сам успомніў, як гадоў восем таму яго прозу вінавацілі ў тым, што яна кідае цень на светлыя камуністычныя дасягненні (пра гэта чытайце тут: М. Байкоў. «Платон Галавач "Дробязі жыцьця"» // Полымя. 1927 г. № 3).

Галавач вельмі перажываў, калі настала новая хваля рэпрэсій (вядомае яго тагачаснае выказванне-пратэст: «Трэба /.../ умець берагчы людзей...»). У гэту змрочную восень 1936 года, калі «...аднойчы раніцай, не далічыліся /.../ Цішкі Гартнага, Міхася Зарэцкага, Алеся Дудара, Тодара Кляшторага...» ён імкнуўся вярнуць Масею Сяднёву веру ў творчыя сілы: «...я прачытаў гэтыя вершы Платону Галавачу. У яго я знайшоў падтрыманне. У маіх вершах Платону Галавачу спадабалася "ўзвышанае, журботнае". У яго было такое перакананне, што мастак без гэтага — як без душы» (Масей Сяднёў. Выбраныя творы. 2014).

4.

На пачатку 80-х гадоў, калі Леанід Дранько-Майсюк у адносна ліберальныя часы (параўноўваем, вядома, са сталіншчынай) стварыў паэму пра Марка Шагала «Віцебск. 1922», то многія вядомыя беларускія паэты глядзелі на калегу з раздражнёным неразуменнем, а ў іх вачах чыталася нямое пытанне: «Нашто цвяліць андропаўскіх гусей нейкім там Шагалам?» Падтрымаў толькі Міхась Стральцоў. Ён захапіўся балетнай свабодай твора, дзе Марк Шагал казаў п'янаму матросу-бальшавіку: «Усё нечаканае дзеецца ў высях. / Я шчыра вам раю, таварыш марак, / Да любай Еўропы па небу прайсціся».

Паэма гэтая змагла быць надрукаванай толькі ў перабудовачныя часы. Пасля іранічна-лёгкага Шагала, які глядзеў на зараджэнне таталітарнага свету з паблажлівай лагодай, аўтар прыдумляе вобраз фатальнага, страшнага ў сваёй няўмольнасці трамвайнага кола, якое павінна раздушыць, знішчыць любыя межы, забароны, скалануць гэты застаялы прэлы беларускі свет, давесці яго да той эмацыянальна-высокай і вострай кропкі, пасля якой, магчыма, і адбудзецца альбо канчатковы канец, альбо новае Нараджэнне. Паэт стварае згаданую ўжо паэму «Кола».

А пяцьдзясят гадоў да гэтага Масею Сяднёву, вязню мінскай турмы, мроіліся свае трамвайныя колы, якія шаравымі маланкамі павінны былі вызваліцца з-пад улады рэек, прабіць сцены камеры і прынесці такую жаданую свабоду, няхай сабе яна будзе рыфмавацца з самім «прадоннем»: «Жудка. Цемень мне сэрца гняце. / Аніяк не магу я заплюшчыць воч: / як у чорную яму, ў густой цемнаце, / імчацца трамваі ў ноч. / Мне здаецца, што з рэек пазьбягалі яны і, б'ючыся на трэскі, у пекла ляцяць. / Насядаюць адзін на адзін, як званы, / і ніякай іх сіле на гэтым шляху не суняць. / Дык хутчэй-жа, хутчэй-жа нясецеся вы! / Каб стрымоўвалі вас — не хачу! — / У нямое прадоньне, на скрут галавы, / я са звонам такім-жа лячу».

І сапраўды, як часам хочацца, каб з'явілася на яве такое «цяжкое, трамвайнае кола», якое «са звонам» імчала б нас «на скрут» заўсёдна-разважлівай і творча-прадказальнай «галавы» куды-небудзь туды, у... прадонне нашай свабоды... Магчыма, пасля такога рызыкоўнага, небяспечнага падарожжа нарэшце знікне і самазадаволеная інертнасць у нашай сучаснай літаратуры, а пытанні стылю, формы, артыстызму стануць для беларускіх пісьменнікаў такімі ж важнымі, якімі былі для Масея Сяднёва, Уладзіміра Дубоўкі, Марка Шагала ці Платона Галавача.

Васіль ДРАНЬКО-МАЙСЮК

Віктар ШНІП

***

Апошні дзень лета трымаецца за павуціну,
Якая бялее, як ніткі, якімі прышыеш
Мой шлях да свайго, і цябе я ніколі не кіну,
Ды толькі мяне, як Амерыку, ты не адкрыеш

У гэты апошні дзень лета, якое знікае,
Нібыта вада, што праліта на бераг пясчаны
З вядра, у якім адна рыбка жыла залатая,
Якую злавіў калі быў, як хлапчук, закаханы

У цень адзіноты, якая за мною хадзіла,
Нібыта прышыта была да мяне назаўсёды,
Якая апошні дзень лета, як волю, любіла
І есці любіла са мною літоўскія шпроты…

Апошні дзень лета трымаецца за павуціну,
Якая бялее, як ніткі, якімі прышыеш
Мой шлях да свайго, і цябе я ніколі не кіну,
Ды толькі мяне, як Амерыку, ты не адкрыеш…

***

Як золата старых ікон, лістота
На Свіслачы, дзе ты ў чаўне плывеш,
Нібы Харон, якому не ахвота
Харонам быць. Ты хочаш быць найперш
Смяротным, як і ўсе, хто ў гэтым свеце
Праплыў па рэках і ў туманах знік,
Дзе з дрэў лістоту абрывае вецер
І сэрца грукае, нібы цягнік,
Ідзе ў табе да станцыі апошняй,
Пазначанай крыжамі і ў смузе,
Дзе ўночы Млечны Шлях, нібыта пожня,
І поўня, як каструля на страсе
Іржавая, што ты закінуў з дому,
Бо вольна ўздумаў жыць, не сумаваць
І, не рыфмуючы раней нікому,
Анёлам вершы на вадзе пісаць…

***

Зноў вечар і ты з адзіноты сваёй выпаўзаеш,
Як сумны бясконца і вечна галодны слімак.
Да шчасця дарогі не бачыш і гора не знаеш,
І жоўтая поўня над светам — спакусны пятак,
Якога табе тут заўжды на віно не хапае
І век яго будзе табе, як віна, не хапаць.
Еўропе не быць залатой, бо Масква залатая,
Я знаю пра гэта, табе ж тут на ўсё напляваць,
Бо вечар ізноўку і ты зноў брыдзеш па праспекце,
Па горадзе Сонца, якога на свеце няма.
Яго ты прыдумаў, і стаў ён найлепшым у свеце,
І ўжо мне пра гэта з табою спрачацца дарма.
І я тут з табою не буду спрачацца ніколі,
Як мудры бясконца і вечны, як вечнасць, габрэй,
А буду ісці па жыцці як па сонечным полі,
Стаяць у чарзе на кватэру, нібы ў маўзалей.

***

У вечара халоднае дыханне,
Нібы крынічная вада ракі,
Дзе сонца скончыла сваё купанне
І ноч прыйшла, як змрочныя вякі.
І, прашаптаўшы перад сном малітву,
Ты спаць кладзешся, а пасля не спіш.
У небе маладзік нібыта брытва,
Ты на яго, самотная, глядзіш.
Табе абрыдла праца і самота
У гэтым расфуфыраным жыцці,
Калі чакаеш, як Хрыста, суботу,
Каб потым анікуды не ісці,
А дома быць, нібыта інваліду,
З якога пасміхаюцца ў двары,
Які гарэлкай запівае крыўду
І ні пра што не хоча гаварыць,
Бо ў вечара халоднае дыханне,
Нібы крынічная вада ракі,
Дзе сонца скончыла сваё купанне
І ноч прыйшла, як змрочныя вякі.

***

пасля начной грымотнай навальніцы
калі здавалася, што знікне свет
ты па праспекце сцішанай сталіцы
ішоў самотны, нібы інсургент,
які вярнуўся з даўняга стагоддзя
у месца роднае адкуль пайшоў
з адвечнай светлай марай аб свабодзе
і не вярнуўся малады дамоў
тады, калі чакалі і кахалі,
цяпер жа тут незразумелы свет
за гэткі свет тады не ваявалі
пра гэткі свет не марыў і Паэт,
які з дажджу, з маланак на праспекце
узнік і знік, нібыта не было,
як і цяпла для нас у гэтым леце
няма хаця камусь і ёсць цяпло
вось гэта навальніца, што грымела
нібы вайна была за гэты свет
дзе для цябе было ўсё зразумела
ты з тымі быў, каго любіў Паэт

***

Наўкол бязмежныя вада і неба
І ты ў чаўне праз цішыню плывеш,
Дзе поўня жоўтая, нібыта з хлеба,
Якую ты вяслом не дастаеш,
А хочацца дастаць, бо ты галодны,
Як воўк, якому тысяча гадоў,
Што з Рыма ўцёк і стаў, як смерць, свабодны
Ад веры, ад надзеі, ад рабоў…

***

Вароны каркаюць самотна ў скверы.
Тут могілкі нядаўна шчэ былі.
Цяпер тут сонныя пенсіянеры
На лаўках, нібы на краі зямлі,
Сядзяць і разглядаюць тых, хто міма
Праходзіць побач з імі, як жыццё
Незразумелае, як і Радзіма,
Што ў іх была і знікла, як лісцё
З бярозы, што засохла ў цэнтры сквера
І ўжо адна, як пугала стаіць,
І родная для ўсіх пенсіянераў,
Бо ёсць пра што маўчаць і гаманіць.
І ты ідзеш па скверы, ты стамлёны.
Не адчуваеш пад сабой зямлі.
І каркаюць услед табе вароны,
Што ўчора салаўямі тут былі.

***

лісце жоўтае падае і засыпае сцяжыну
па якой не хадзіў і не будзеш ніколі хадзіць
як нідзе не сустрэнеш жывой каля мора дзяўчыну
хоць ты можаш дзяўчыну і мора да смерці любіць
што жывуць на карціне якую ў музеі ты бачыў
і яна для цябе прашаптала а што не пачуў
за машынаю сонца ляцела як вогненны мячык
і дзяўчына з карціны за сонцам ляцела ўваччу
і далёка як мроя застаўся іспанскі той бераг
і маленечкі горад якога на картах няма
ты прыкуты да роднай зямлі як рабы да галераў
і цябе адрываць ад крыжоў як ад вёслаў дарма
і лісцём як пяскамі тваё засыпаецца ўчора
ды як грэшнік прад Богам стаіць так стаяць
прад табой
нібы сонца што стала вадой залацістае мора
і дзяўчына якая ніколі не будзе зямлёй

***

за апошні радок зачапіўся нібы за апошні вагон
цягніка што ішоў праз туман у краіну дзе мора і лета
распалохаўшы сонных даўно і старых вераб'ёў і варон
з рук тваіх на зямлю амаль цэлую вечнасць ляцела
газета
дзе апошні радок запрашаў у цягнік што да мора ішоў
і ты сеў у цягнік у апошні вагон не сказаўшы бывай
тым хто любіць цябе хто з табой нат без зброі
да смерці гатоў
бараніць калі стане патрэбным як волю сваю родны
край
пройдзе час як цягнік і дадому зноў вернешся ты
як заўсёды вяртаўся адтуль дзе гасцінныя людзі і лета
і ніхто не сустрэне цябе адны толькі ля хатаў платы
пабягуць і ўзляціць над дарогай як птушка старая
газета

***

Не згарыць пад нагамі апалае мокрае лісце
І на захадзе сонца не ўзыдзе ніколі, як нам
Аніколі тут з белага свету жывымі не выйсці
У свет іншы, сябе не забіўшы, нібыта свой Храм
Не ўзарваўшы. І ты ўжо апалае мокрае лісце
Вымятаеш з двара, са свайго зацішнога жыцця,
Як цябе вымяталі кар'ерныя людцы калісьці
Са сцяжыны сваёй, прыраўняўшы людзей да лісця.
Ды гарыць пад нагамі апалае мокрае лісце
І на захадзе сонца ўзыходзіць і нам
Адзіноту сваю за пісьмовым сталом пераплысці,
Як раку, і ў калюзе ўтануць на дарозе, што ў Храм.

Алесь ДУБРОЎСКІ-САРОЧАНКАЎ

Восень

1. Чыстае мастацтва

Дзень сонечны ў пачатку верасня,
пра смерць не думаюць сады…
А праўда ў тым, што гэтак пелася —
жыццё так пелася — заўжды.

Ды чутны гэты спеў не кожнаму…
Чароўнае трымценне струн,
пад дотыкамі асцярожнымі
трапечуць клавішы секунд.

Акорды верасня празрыстыя:
Сусвет імправізуе так.
І гэта гук мастацтва чыстага,
таму што чысты сам Мастак.

2. Бабіна лета

Здаецца свет такім сур'ёзным
праз шкло будзённай мітусні,
здаюцца дзень і вечар позні,
здаюцца цемра і агні…

Але кастрычнік не здаецца:
турбот бязглуздых здзьмухнуў стос;
і лета бабіна ліецца
празрыстым золатам з бяроз.

І гэта золата — не ўяўнасць…
І ловіш адкрыццё: няўжо
так прабіваецца сапраўднасць
праз мураванне міражоў!

***

Сустрэцца з пустатой Сусвету,
з бяздоннем вечнай цішыні —
вось нашага блукання мэта,
здабытак нашай мітусні.

Аднойчы ўбачыць праўду гэту —
што свет напоўнены н і ч ы м,
і хараство яго прапета
маўчання голасам святым.

І сярод гэтага маўчання —
як без агню самотны дым,
тваё сірочае дыханне
трымціць у космасе пустым.

І так канчаецца блуканне
і пачынаецца жыццё.
Знайсці пясчынку існавання
СВАЙГО — вось праўды адкрыццё.

Цар Давід

Вірсавіі вясёлай валасы,
і мужнага Іанафана плечы,
Авесалома смех — усё знявечыў
няспынны час. І толькі галасы
яшчэ гучаць, і з памяці не сцерці
ніводнага з іх аж да самай смерці.

Вірсавіі пяшчотная рука,
Іанафана твар, румяна-белы…
Усё гэта — жыцця святое цела,
а дух яго — імклівая рака,
вада якой — скрозь пальцы —
і ў бязмежжа…
І толькі камяні ўздоўж узбярэжжа.

***

Кожны акорд — пра ЯГО,
кожны такт партытуры Сусвету,
кожнай істоты сляза
і стварэння кожнага ўдых.
Вывучыць ноты хачу,
бо адвечная мара паэта —
выканаць партыю так,
каб пачуў хоць адзін з глухіх.

Раіса ДЗЕЙКУН

ГЭЙ, ТЫ, БУЛЬБАЧКА МАЯ!

Каб толькі мог, дык я б, няйначай,
Даў бульбе лепшую з адзнак —
Ах бульба, бульба, што за ўдача,
Што за выгода, што за смак!
Пятрусь Броўка

ЦАПКА-ЦАРАПКА

У казённай кватэры вялікага драўлянага будынка-казармы, што стаяў непадалёк ад чыгуначнага пераезду, пасялілася новая сямейная пара Станіслава Пракаповіча. Спачатку галава сям'і працаваў простым манцёрам пуці, а неўзабаве, агледзеўшы, што ён — мужчына спакойны, працавіты, а галоўнае — не пітушчы — начальства прызначыла яго брыгадзірам самай вялікай брыгады пуцейцаў акалодка, які абслугоўваў ветку «Гомель — Хойнікі». Пракаповічы прыехалі, гаварылі, аднекуль з-пад Гродна. Чаму сюды, ажно на гэтую станцыю-пасёлак на другім канцы Беларусі, ніхто не ведаў. Ды, па праўдзе кажучы, не пра гэта пойдзе гаворка.

Перасяленцам, як і ўсім чыгуначнікам, выдзелілі латку зямлі, што была побач з чыгункай. Яны пасадзілі на ёй бульбу, а на меншым кавалачку — грады: цыбулю, гуркі, капусту, іншую ўсялякую зеляніну.

Навасёлы былі вельмі маўклівыя, не кампанейскія. Ні з кім ні ў казарме, дзе жылі сем'і пуцейцаў, ні ў пасёлку Пракаповічы так і не сышліся, не пасябравалі. Станіслаў быў высокі, хударлявы, яго жонка — на галаву ніжэйшая, зграбная кабета і таксама дзіўнаватая. Ніхто не бачыў, каб яна недзе з мясцовымі жанчынамі мянціла языком. Моўчкі корпалася на гародчыку, а то штосьці рабіла па гаспадарцы ў хаце-кватэры. Час ад часу на выхадныя да іх прыязджаў сын — высокі (у бацьку), прыгожы і такі ж маўклівы. Ён вучыўся недзе ў абласным цэнтры. Шмат хто з мясцовых прыгажунь намагаўся звярнуць на сябе ўвагу хлопца — як гарохам аб сценку. Ён нават у клуб не хадзіў.

«Сектант нейкі», — шапталіся дзяўчаты за спінай у хлопца, бо якая ж дзяўчына пацерпіць такую непавагу да сябе!

Маўчуны — такая мянушка прычапілася хутка да ўсёй гэтай сям'і ў пасёлку. Прынамсі, пакуль яны там жылі. Пасля ўжо вакольнымі шляхамі да пасялкоўцаў дайшлі чуткі, што не проста так Маўчун забіўся ў глухі кут (чыгуначная ветка была тупіковаю). Што дзесьці там, адкуль прыехаў, чагосьці ліхога нарабіў, сядзеў у турме і, каб не калолі вочы землякі, з'ехаў з сям'ёю ў белы свет — калясіў па чыгунцы, па яе казённых кватэрах.

Ну, ды Бог з імі — кожны ў жыцці, раней ці пазней, абавязкова спакутуе за свае грахі.

Як і ўсе навокал, Маўчуны палолі, акучвалі сваю бульбу. Гаспадар дапамагаў жонцы, а калі з'яўляўся сын, дык і той станавіўся побач з маці. Але вось настала пара копкі і найбліжэйшыя да Маўчуноў суседзі па ўчастках зямлі зрабіліся сведкамі нябачанага дагэтуль: бацька, маці і сын пасталі на рады бульбы поруч і пачалі выкопваць яе нейкім зусім незвычайным для гэтых мясцін спосабам. Прычым не капаць, а неяк дзяўбаць. У руках кожнага была капаніца, але не такая, як абкопваюць бульбу, — з суцэльнай металічнай пласцінкай, а з чатырма зубцамі, крыху распляскаными на канцах.

Так спакон веку тут бульбу ніхто не капаў. Звычайна мужчыны рыдлёўкамі падкопвалі кусты-калівы, а потым жонкі, вырваўшы куст з клубнямі, абтрэсвалі, разграбалі рукамі вакол каліва, выбіраючы караняплоды. Некаторыя з мужчын ад самай раніцы накопвалі «пра запас» цэлыя латкі ды беглі па дзённых справах хто куды, а жанчыны потым ужо разам з дзецьмі станавіліся бульбу выбіраць. Гэта ў буднія дні. А ў выхадныя падкопачы былі побач: то кашы высыпаюць у мяшкі ці ў грудкі, тут жа на полі, — каб бульба ветрам прадзьмувалася, высыхала.

Суседзі (найперш жанчыны) пачалі прыглядацца да Маўчуноў і іх незвычайных прылад. Некаторыя жонкі ажно подбегам кінуліся разглядаць той дзіўны інструмент. Найбольш апантаныя пачалі ўпрошваць сваіх мужоў змайстраваць ім гэткія самыя на кузні мясцовага абозаколавага завода. Мужчыны заўпарціліся: трэба ж яшчэ разабрацца з тымі новымі капаніцамі! Яны адразу скумекалі: гэта ж ім, выходзіць, давядзецца станавіцца побач са сваімі жонкамі і апрацоўваць з імі разам тую няшчасную бульбу. Трэба было адбівацца ад такой неспадзяванкі, нешта рабіць, а не чакаць ля мора пагоды. Мужыкі неадкладна сышліся на перакур.

— Я не буду «дзятлам»! — катэгарычна заявіў Сідар Баранок з абвіслымі, жоўтымі ад самакрутак вусамі, які меў мянушку Кілаваты, бо хадзіў, шырока расставіўшы ногі. Ад мужчын, што разам з ім наведвалі чыгуначную лазню — лепшую ў пасёлку, — жонкі дазналіся, што ў таго вырасла паміж ног вялікая кіла і замінала яму нармальна хадзіць. Ведалі ўсе і ад чаго надарылася з ім такая бяда: надарваўся Сідар, калі будаваў сваю невялічкую хату — кожнае ж бервяно на плячах давялося цягаць. Яму спачувалі, але мянушку ўсё адно далі. Ён не быў выключэннем — усе мелі свае мянушкі ў гэтым пасёлку: ад простай і немудрагелістай Сідарыхі, да зусім незразумелай Етвы. Апошняя была незразумелая для чужых, а для сваіх вельмі нават цямная: яе ўладальнік, задзірысты Іван Шкірман, праз кожнае слова гаварыў «етва»:

— А што, етва я вельмі хочу ім быць і вунь ён хоча?! — так і тут узвіўся ён, ківаючы галавою ў бок Сцяпана Навуменкі, які меў мянушку Ціхоня. — Етва ж патрэбна прычыну нейкую прыдумаць, каб раз і назаўсёды адбіць у нашых баб ахвоту да той капачкі.

Мужыкі зацягнуліся цыгаркамі, закашляліся.

— І што яны ў іх такога харошага знайшлі? Як тыя граблі, толькі зубоў менш, ды і тыя доўгія, як дзюба ў бусла. Дзяўбаць толькі тымі зубамі бульбу няшчасную ды псаваць яе, — уголас разважаў Сідар. Цапка-царапка нейкая.

— Як ты сказаў? — аж страпянуўся Іван Етва. — Усё, мужыкі, з вас паўлітра, мы выратаваны! Твая праўда, Сідар! Куды ж прытуліць пашкоджаную, падзяўбаную бульбу: у капец — етва ж не гадзіцца; у сцёбку — тое самае, етва; у падпол у хаце — зноў-такі, етва, пагніе падзяўбаная.

— Твая праўда, Іван, — падаў голас Ціхоня. — Але ж патрэбна, каб не ад нас гэта дайшло да нашых баб. Яны ж — касцьмі лягуць, а каб па-іхняму было.

— А давайце падгрэчым старую Бортнічыху-варажбітку. Яна ж век не бачыла той цапкі-царапкі, прывыкла да лапаты, як і мы ўсе. Увядзём ёй у вушы, што Маўчуны здзекуюцца з бульбы, калечаць. Да яе ж нашы бабы прыслухаюцца, — падвёў перакур Сідар.

Мужыкі дасмалілі самакруткі і, хітра пасмейваючыся, пакіравалі кожны на свой загон. Была субота. На змярканні таго ж дня Етва пабываў у старой Бортнічыхі.

Назаўтра, у нядзелю, копка бульбы ішла па старой завядзёнцы. Жонкі зноў падступіліся да сваіх мужчын з патрабаваннямі зрабіць ім такія ж, як у Маўчуноў, капачкі. Мужыкі паціху адбрэхваліся, а самі неўпрыкмет паглядалі ў бок вуліцы. Нарэшце, абапіраючыся на сукаваты кіёчак, адтуль паказалася Бортнічыха. Ківаючы сваёй ссівелай галавой на здароўканне, якое неслася з усіх бакоў, яна дакульгала да Маўчуноў. Павіталася з імі, пажадала добрай бульбы і Бога ў дапамогу. Тыя штосьці прабурчэлі ў адказ.

Бортнічыха абаперлася на сваю каменьку і пачала моўчкі пазіраць на працэс капання царапкай. Маўчуны пад яе пільным наглядам не так спрытна пачалі дзяўбаць зямлю, часцей білі па бульбе, і тая, пакалечаная, разарваная на кавалкі, трапляла ў кашы ў такім непрывабным стане, што старая не вытрымала:

— Нейкія агрызкі, а не бульба, — абурылася ўголас Бортнічыха. — Гэтая цапка-царапка рве, шматуе бульбу на кавалкі. Дзе ета хто бачыў, каб бульбу рвалі жывасілам? Не гадзіцца нам такая копка, — сказала як адрэзала старая. І пакульгала ў бок сваёй хаты.

Усе, хто быў на полі, з заміраннем сачылі за ўсім гэтым спектаклем, разыграным як па нотах мужчынамі і выкананым старой і вельмі шаноўнай жанчынай. Мужыкі ад шчасця былі на сёмым небе. А старая Бортнічыха па дарозе дадому не магла ўтаймаваць гнеў:

— Ета ж нада так здзекавацца са свята-га? — чулася яе мармытанне.

Да канца капання ў той дзень ні адна жонка не раскрыла рот на свайго чалавека пра новую капаніцу. Мужыкі таксама памоўчвалі і не нарываліся на спрэчку.

Ужо дома жонка Сцяпана Ціхоні звярнулася за вячэрай да свайго чалавека:

— Ты ўжо замовіў царапку?

— Замовіў, а як жа, — устрапянуўся той. — Але ж вунь што Бортнічыха сказала, — спаслаўся на аўтарытэт Ціхоня.

— Ведаю, сама чула, але не адмяняй заказ. Згадзіцца пырнік выцягваць.

— Гэта ты добра, правільна рашыла, — узрадаваўся Ціхоня. А сам тым часам мікіціў, як у ліку апошніх замовіць кавалю на заводзе тую заразу — царапку, бо ён жа і не думаў гэтага рабіць. Яшчэ чаго…

Так і не прыжылася ў нашых краях цапка-царапка. Але ж хто-ніхто ўсё-ткі паспеў пад націскам сваіх жонак замовіць і зрабіць яе, а хто і сам выкляпаў штосьці падобнае. Але бабы выкарыстоўвалі царапку толькі на разбіўцы пырнікавых адвалаў ды на балотных дзялянках, дзе бульба была вадзяная і ішла на корм скаціне. А сям'я Маўчуноў з'ехала з той кватэры гэтак жа хутка, як і з'явілася. Мабыць, да Пракаповічаў дайшлі чуткі, што мясцовы народ іх ужо раскусіў. Яны паехалі далей, на іншую ветку-тупік, прыхапіўшы з сабою свае цапкі-царапкі.

ГАЛОДНАЯ

Суседка суседцы:

— Моця, а што ета ты тры разы на дзень на ганку, нагнуўшыся, робіш? Гэта ж як гляну ў акно — ты стаіш і ўсё поркаешся. А я разгледзець не магу, чым ты там займаешся? Вочы мае ўжо не тыя, слых не той… Дык што ў цябе за работа такая, каму ты кланяешся тамака?

— Як каму? Бульбе! Бульбу луплю!

— Унё! Цэлымі днямі?! Куды табе столькі?

— Куды-куды? На кудыкіну гару — сабе!

— Авойці мне! Гасподзь з табой!

— А што я зраблю, як мне яе хочацца ўвесь час — зранку, удзень, увечары! Я ж калі бульбы не паем, дык галодная хаджу.

БУЛЬБА — ЯНА І Ў РЭСТАРАНЕ БУЛЬБА!

— Чаго ты тую бульбу прэш, як ніколі не бачыў, ды яшчэ з хлебам? Бяры отое і отое. Не ведаю, праўда, як яно называецца, але ж з дарагіх прадуктаў намяшана і выглядае апетытна. А бульбы і дома наясіся ўволю, дурань ты! — выгаворвала Насця мужу Карнею, седзячы за вясельным сталом сваёй дачкі ў рэстаране далёкага горада.

— Ну не скажы, жонка. «Отое», на што ты паказваеш, — не раўнуючы як тая твая мяшанка для свіней, а бульба — яна і ў рэстаране бульбай застаецца, — адмахнуўся ад жонкі чалавек і зноў пацягнуўся да талеркі з такой знаёмай і роднай стравай.

ПУСЦЕНЬКАЯ ВЯЧЭРА

Бацькі прыехалі да дачкі ў госці ў вялікі горад на беразе Балтыйскага мора. Яна выскачыла туды замуж за вайскоўца. Звычайна дзеці самі прыязджалі з «канца свету» да бацькоў падчас адпачынку, а тут запрасілі да сябе. Тыя і выбраліся, калі бульбу выкапалі.

З сабой яны прывезлі з сяла гасцінцаў — сухіх грыбоў і чарніц, арэхаў-лузанцоў, варэння з брусніц. Дачка ўзрадавалася — роднай дамоўкай павеяла: нюхае нізкіманісты з грыбоў, арэхі тыя набірае ў прыгаршчы і пускае струменьчыкам назад у зрэбны мяшэчак, тое самае робіць з чарніцамі, а варэнне тут жа смакуе чайнай лыжачкай, падсоўвае маленькаму сыну і мужу.

Бацькі таксама радыя, што дагадзілі дачцэ. А зяць глядзіць на ўсё гэта і паблажліва ў вусы ўсміхаецца, маўляў, вось зараз я сваімі гасцінцамі вас, родзічы, здзіўлю дык здзіўлю.

Маленькі ўнук па-свойму рэагуе на тое, што адбываецца: падскоквае-шчабеча вакол дзеда з бабай і іх гасцінцаў і ўсё спрабуе высыпаць лузанцы на падлогу.

Але ж з дарогі, як водзіцца, гасцей частаваць патрэбна. Дзеці накрылі стол. Чаго толькі там не было, а рыбы — дык усялякай і ў розным выглядзе. Ведама, горад марскі. Тры парты мае, адзін з іх — рыбны. Зяць ці не ўвесь фірмовы магазін «Дары мора» скупіў. Дачка пастаралася: нагатавала і рыбы той, і салатаў розных.

Паселі, выпілі па кроплі, паелі. Пагаманілі.

— Усё добра, дзеткі мае, дзякуй вам, стараліся, — устала з-за стала маці, а за ёй — бацька. — Але ж вячэра ваша была пусценькая. Сама, дачушка, ведаеш, чаму. Які ж ета наедак без бульбы? Без яе ж і ног не пацягнеш на рабоце…

Падарожжа ў часе: станаўленне чацвёртай сталіцы

З 1067 года — першага пісьмовага згадвання пра Мінск у летапісе «Слова пра паход Ігаравы» — мінуў 951 год. Што нам вядома пра гісторыю чацвёртай, сучаснай сталіцы на беларускай зямлі? Горад у эпоху вікінгаў быў пабудаваны полацкімі князямі на паўднёвых межах дзяржавы, найбуйнейшай у сярэднявечнай Еўропе, для аховы ад нападаў з боку Кіеўскай Русі. Полацкае княства (X—XIV стст.) было моцным і магутным, распасціралася ад Рыгі да Менска, змагалася з ворагамі і актыўна гандлявала на выгадным шляху з «варагаў у грэкі», мела васалаў, каля 70 гадоў знаходзілася пад уладай Кіева, а ў XIV ст. увайшло ў склад ВКЛ.

АРХЕАЛАГІЧНАЯ СЕНСАЦЫЯ

У 1980-я гады ў цэнтры Мінска, на месцы старажытнага замчышча, пры ўпадзенні ракі Нямігі ў Свіслач, праводзіліся археалагічныя раскопкі. Зробленыя знаходкі сталі сенсацыяй. Будынкі выглядалі не зусім так, як іх уяўляў вядомы гісторык Эдуард Загарульскі, як паказвалі падручнікі. Дык якім насамрэч быў Мінск у XI ст.?

— Нам вядома, што спачатку існавала паселішча на рацэ Менцы, — распавёў археолаг Інстытута гісторыі НАН Беларусі Сяргей Дзярновіч. — У 1067 годзе, паводле летапісу, горад на Менцы разбурылі і перанеслі на новае месца. Дакладней, пачалося будаўніцтва новага цэнтра мінскай зямлі на рацэ Няміга. Археалагічныя раскопкі пацвердзілі гэты факт. Што датычыць архітэктурных асаблівасцей, то яны характэрны для будаўнічай традыцыі той эпохі. Замчышча ўзводзілі мясцовыя жыхары — нашчадкі балтаў, якія жылі тут больш як 3000 гадоў, славянаў, якія прыйшлі на гэтыя землі ў VII ст., і нарманаў, што аселі ў VI—XII стст. Падчас раскопак быў знойдзены залаты бранзалет, датаваны XII—XIII стст. — постэпохай вікінгаў. Гэтая рэч мае дачыненне хутчэй за ўсё да дынастычных сувязей менскіх князёў са скандынаўскімі валадарамі, магчыма, з Соф'яй Мінскай, дачкой князя Глеба Мінскага.

Такім чынам, у XI ст. Мінск быў горадам-фартэцыяй магутнага Полацкага княства. Яго сталіца Полацк уяўляў сабой буйны палітычны, эканамічны і адміністрацыйны цэнтр на месцы ўпадзення ракі Палаты ў Дзвіну. З прыходам да ўлады Рагвалода (Рогнвальда) горад пачынае збіраць і прыводзіць у рух прылеглыя тэрыторыі. Падобных паселішчаў да прыходу Рагвалода на тэрыторыі Беларусі было досыць шмат. Мінск таксама развіваецца і робіцца сталіцай княства ўдзельнага валадара Глеба Мінскага — сына Усяслава Чарадзея (сына Брачыслава — нашчадкаў Рагвалода і Рагнеды).

ГАСПАДАР НЁМАНСКАГА ШЛЯХУ «З ВАРАГАЎ У ГРЭКІ»

— У 1104 годзе полацкі князь Барыс-Рагвалод адправіў на княжанне ў Менск Глеба Усяславіча, як сёння казалі б, узначаліць адміністрацыйны цэнтр кіравання Нёманскага адгалінавання гандлёвага шляху «з варагаў у грэкі», — патлумачыў Сяргей Дзярновіч. — Глеб пераарыентаваў Нёманскі шлях па Свіслачы да Дняпра. З'яўляюцца гарадзішчы Свіслач, Ялізава, Копысь. Мінскі князь кантралюе два важныя адгалінаванні Нёманскага і Дняпроўскага гандлёвага шляху, што выклікае незадаволенасць кіеўскага князя Святаполка, які ў 1104 годзе выпраўляе ў паход супраць Глеба свае дружыны. Мінск вытрымлівае дзевяцімесячную аблогу. Пасля гэтага кіеўскі князь Манамах ідзе на хітрасць і бярэ ў палон Глеба, які потым гіне ў кіеўскай вязніцы.

Якім быў старажытны Менск?

— Казаць пра гэта зарана, бо не ўсё да канца вывучана, — распавёў археолаг Інстытута гісторыі НАН Беларусі Аляксандр Мядзведзеў. — Калі браць паўночны ўскраек замчышча (на жаль, у 1950—1960-я гады пры ўладкаванні праспекта Пераможцаў яго часткова знеслі), згублены культурны пласт замчышча. Пасля вывучэння тэрыторыі каля станцыі метро «Няміга» зрабілі некалькі рэканструкцый, паказаўшы, як выглядаў адзін з меркаваных уездаў у горад. Там, дзе стаіць спартыўны павільён, меркавана, знаходзіўся палац мінскага князя. На гэтым месцы захаваліся рэшткі культурнага пласта з часткай вуліцы. Цяпер яны закансерваваныя. Замчышча займала даволі вялікую плошчу і заходзіла за тэрыторыю дома, які знаходзіцца насупраць па праспекце Пераможцаў. Раскопкі вяліся ў яго дварах. Мы да мацерыка пакуль не дайшлі, спыніліся на ўзроўні XIII ст. На заходнім ускрайку замчышча да канца не даследаваны культурны пласт. Гэта праца на будучыню.

РЭНЕСАНС МІНСКАГА ЗАМЧЫШЧА

Дарэчы, Аляксадр Мядзведзеў упэўнены: Мінскае замчышча можна аднавіць. Праўда, археолагі пакуль не ведаюць, наколькі моцна падмурак будынка спартыўнага павільёна разбурыў культурны пласт. Ці ёсць там рэшткі, якія датычацца канца XI, XII і XIII стст.? Калі такія работы пройдуць, частковая рэканструкцыя здолее ажыццявіцца. Палац, рэшткі якога выявілі падчас раскопак, належаў князю Глебу. Быў знойдзены таксама найстаражытнейшы хрысціянскі храм Мінска, датаваны XI ст., які закладзены паводле не візантыйскага, а рымскага ўзору. Магчыма, гэта было звязана з тым, што жонка князя Глеба нарадзілася ў Польшчы і была каталічкай. Цалкам будынак не быў раскапаны. Дарэчы, цікавых знаходак на Мінскім замчышчы вельмі шмат. Знайшлі нават майстэрні, дзе абпальвалі вапну.



Адна з рэканструкцый брамы дзяцінца Мінска.

Рэканструкцыя, рэстаўрацыя падобных канструкцый — асобная галіна ведаў, цэлая індустрыя, якую яшчэ трэба стварыць. І тут будуць запатрабаваныя архітэктары, канструктары, хімікі, рэстаўратары, гісторыкі, археолагі.

Наталія АЛЕСЯЕЎСКАЯ

БЯСЦЭННЫ ДОСВЕД

Спадчына аўтара канцэптуальных экспазіцый пра лёсы літаратараў

Сёлета музейная грамадскасць Беларусі адзначае 85-годдзе з дня нараджэння вядомага музеязнаўцы Міхаіла Іванавіча Пратасевіча, які аддаў музейнай справе многія гады жыцця. Працаваў вучоным сакратаром, намеснікам дырэктара па навуковай рабоце Літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, загадчыкам навукова-экспазіцыйнага аддзела ў Аб'яднанні дзяржаўных літаратурных музеяў. З 2004 па 2008 гг. Міхаіл Іванавіч Пратасевіч быў намеснікам дырэктара па навуковай рабоце Літаратурнага музея Петруся Броўкі.

Выступаў у друку з 1959 года. Падрыхтаваў шэраг артыкулаў па коласазнаўстве ў перыёдыцы і энцыклапедычных выданнях, а таксама публікацыі ў выданнях Коласавай спадчыны. Браў удзел у многіх навуковых канферэнцыях, у тым ліку Узвышаўскіх чытаннях (2003—2004 гг.), Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі «Пятрусь Броўка і яго час», прысвечанай стагоддзю з дня нараджэння паэта (24 чэрвеня 2005 г.) і іншых.

Былы супрацоўнік дзяржаўнага Літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Алесь Камароўскі ўспамінае: «У яго за плячыма амаль усе экспазіцыі, распрацаваныя і зробленыя сумесна з мастакамі да пяцідзесяцігадовых юбілеяў народнага песняра. Пры гэтым ён трымаўся залатога правіла — паказаць Я. Коласа не толькі як пісьменніка, але і як грамадскага дзеяча, чалавека з тонкай і балеснай душой, гатовага адгукнуцца на любую просьбу. Міхаіл Іванавіч шмат працаваў у архівах і бібліятэках. Каб факты біяграфіі песняра былі дакладныя, днямі праседжваў са старэйшым сынам Якуба Коласа Данілам Канстанцінавічам, запісваў яго ўспаміны. Вялікую працу ён вёў па росшуку фотаздымкаў, рукапісаў народнага паэта, замаўляў ілюстрацыі да вядомых твораў». Істотна, што М. Пратасевіч не баяўся ўводзіць новыя матэрыялы ў экспазіцыю, ведаючы, што гэта яшчэ глыбей адлюструе жыццёвы і творчы шлях Якуба Коласа. Акрамя таго, ў абавязак Міхаіла Іванавіча ўваходзіла распрацоўка экспазіцыі ў філіялах музея: у Акінчыцах, Ластку, Альбуці і Смольні. Ён часта туды выязджаў, гутарыў з сёстрамі і братам паэта, каб потым прыняць канчатковае рашэнне аб выкарыстанні таго ці іншага стэнда. Міхаіл Пратасевіч ініцыяваў выданне альбома «Якуб Колас» з добрым тэкстам і ілюстрацыйнымі матэрыяламі для школ і бібліятэк. «Гэтая кніга і сёння актуальная пры вывучэнні біяграфіі і твораў народнага песняра», — упэўнены супрацоўнікі музея і літаратуразнаўцы.

Немалаважна і тое, што Пратасевіч — аўтар канцэпцый і тэматычных планаў Літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа і яго філіялаў на радзіме паэта, экспазіцыі пра літаратурнае жыццё Беларусі 1920—1930-х гг. у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры, музея М. Гарэцкага ў вёсцы Багацькаўка (Мсціслаўскі раён Магілёўскай вобласці), стацыянарных выставак пра творчасць Цёткі (А. Пашкевіч), творчасць П. Броўкі (Літаратурны музей П. Броўкі), пра народную і пісьменніцкую беларускую казку («Дзіва») і іншых экспазіцый. Быў аўтарам тэматычных перадач на радыё і тэлебачанні.

М. Пратасевіч кіраваў стварэннем у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры выстаўкі «Покліч», прысвечанай рэпрэсаваным пісьменнікам Беларусі. Трагічны лёс нашых творцаў быў паказаны на фоне літаратурнага жыцця рэспублікі.

Погляд Пратасевіча на стварэнне экспазіцый выкарыстоўваецца музейнымі супрацоўнікамі і сёння. Хочацца, каб новыя пакаленні музейшчыкаў звярталіся да яго вопыту пры стварэнні новых экспазіцый.

Ганна КУЗЮКОВІЧ,
малодшы навуковы супрацоўнік філіяла «Літаратурны музей Петруся Броўкі» Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры

Год малой радзімы

СТРАЧАНАЯ СВЯТЫНЯ

Даследуючы лёс храмаў раёна ў час Першай сусветнай вайны, звярнуў увагу на адзін неверагодны факт. Па розныя бакі лініі фронту, якая падзяліла тады Смаргоншчыну папалам, апынуліся святыні дзвюх асноўных хрысціянскіх канфесій. Амаль усе, за невялікім выключэннем, праваслаўныя цэрквы і капліцы трапілі ва ўсходнюю частку, а каталіцкія касцёлы і капліцы апынуліся ў заходняй частцы ад мяжы супрацьстаяння. У мінулым прыкладна па гэтай лініі пралягала мяжа паміж балцкімі і славянскімі плямёнамі, у глабальным маштабе — паміж усходнімі і заходнімі цывілізацыямі, і таму становіцца дзіўным, што фронт прыпыніўся менавіта ў гэтых мясцінах.

Такое ж не меншае дзіва — новыя звесткі па гісторыі праваслаўнай царквы ў Святлянах. Усё пачалося з дасланых для вывучэння некалькіх здымкаў ваеннай пары, дзе быў адлюстраваны велічны мураваны храм. На адваротным баку фотакартак удакладнялася яго месцазнаходжанне — вёска Рыбакі. Трэба заўважыць, што геаграфічна царква знаходзіцца бліжэй да в. Рыбакі, таму ў нямецкіх крыніцах яе адносілі да гэтага населенага пункта, а не да маёнтка ці вёскі Святляны. Цяжка адразу было паверыць, што раней на месцы сённяшняга святлянскага храма Пятра і Паўла знаходзіўся такі ўнікальны архітэктурны помнік. Так пачалося даследаванне малавядомага фрагмента з яго гісторыі.

Жменьку каштоўных фактаў з жыцця святлянскай Ільінскай царквы Свянцянскага благачыння можна знайсці ў статыстычным апісанні праваслаўных прыходаў Літоўскай епархіі за 1893 год. У гэты час мясцовая царква недастаткова забяспечвалася царкоўным начыннем, ёй належала 115 дзесяцін зямлі, з якіх 75 былі няўдобіцай. Святар жыў за шэсць вёрст ад царквы ў сваім доме. У псаломшчыка царкоўны дом быў стары. Да прыходу адносіліся 100 двароў і 813 прыхаджан. Варта адзначыць, што ў 1913 годзе колькасць прыхаджан павялічылася напалову і склала 1009 вернікаў.

Да пачатку мінулага стагоддзя адносіцца першы вядомы сёння фотаздымак тагачаснай царквы. Знаходзіцца ён у даваенным альбоме, які захоўваецца ў аддзеле старадрукаў і рукапісаў бібліятэкі Акадэміі навук. З гэтага фотадакумента і пазнейшых фотаздымкаў ваеннай пары можна ўзнавіць выгляд царквы, пабудаванай у тыповым рэтраспектыўнарускім стылі. Мела яна чатырохчасткавую аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю, якая складалася з трох'яруснай званіцы, прамавугольнай трапезнай, кубападобнай малітоўнай залы і апсіды. Шатровае пакрыццё званіцы і чатырохсхільны дах асноўнага аб'ёму завершаны цыбулепадобнымі галоўкамі. У аздабленні будынка выкарыстаны формы старажытнарускага дойлідства. Маляўнічасць знешняму выгляду святыні надавалі кілепадобныя аркі, аркатурныя фрызы, лапаткі, прафіяваныя карнізы. Цвінтар акаймаваны бутавай агароджай з брамамі: адна — пры цэнтральным уваходзе, другая — з паўднёва-ўсходняга боку. Уяўленне пра выгляд храма могуць даць падобныя па архітэктуры і ўзведзеныя адначасова цэрквы ў Турэйску і Ракавічах Лідскага павета, Грыгаровічах і Новым Пагосце — Дзісненскага, Крайску — Вілейскага, Дубіне — Ашмянскага павета. Па мясцовым

Святлянская царква да Першай сусветнай вайны.

Першая грунтоўная публікацыя, прысвечаная царкве ў Святлянах, з'явілася ў смаргонскай раёнцы «Светлым шляху» 11 ліпеня 2007 года. У матэрыяле «Храм Пятра і Паўла» Ала Страшынская ўзнавіла цікавыя старонкі з гісторыі святыні, падрабязна ўзнавіла пачутыя паданні і назвала людзей, што ўзялі ўдзел у яго адраджэнні. Але, на жаль, яе суразмоўцамі не была закранута тэма мураванага папярэдніка сённяшняга храма. Давялося звярнуцца да матэрыялаў Надзеі Маркавай, якая на працягу дзесяцігоддзяў занатоўвала ўспаміны мясцовых старажылаў. З успамінаў жыхара в. Вайнідзяняты В. Яраша стала вядома, што «Святлянскую каменную царкву разабралі немцы ў Першую сусветную вайну для сваіх пабудоў». Паступова, з іншых пісьмовых крыніц, пачалося ўзнаўленне даваеннай гісторыі царквы Святога Ільі ў Святлянах (менавіта гэты святы першапачаткова быў заступнікам святлянскага храма і атуляў сваёй ласкай).

Штогоднік «Обзор Виленской губернии» за 1871 год дапамог знайсці год пачатку пабудовы царквы, а асобнік гэтага выдання за 1875 год удакладніў дату заканчэння будаўніцтва новай мураванай царквы ў Святлянах Свянцянскага павета. Памятныя кніжкі Віленскай губерні за гэтыя гады зафіксавалі імя святара, які кіраваў будаўніцтвам. Ім быў Дзмітрый Някрасаў, якога ў пачатку 1875 года змяніў псаломшчык Павел Вінаградаў.

паданні, Міхневіцкая царква раней была пабудавана па падобным плане і той самай будаўнічай арцеллю, якая потым узвяла царкву ў Святлянах.

Падчас Першай сусветнай вайны знешні выгляд святлянскай святыні мяняецца. Заўважаны значныя пашкоджанні даху малітоўнай залы, знявечана завяршэнне званіцы, тэрыторыя вакол царквы перарыта нямецкімі траншэямі і аплецена калючым дротам. Магутнае бетоннае ўмацаванне за могілкамі дагэтуль нагадвае пра маштаб пераўтварэнняў таго часу. Відавочна, што далейшыя ваенныя дзеянні зруйнавалі царкву, а будаўнічыя матэрыялы часткова выкарысталі акупанты. Па ўспамінах Фёдара Радзько, які пачуў гэтыя каштоўныя звесткі ад свайго бацькі, храм быў разбураны артылерыяй, рэшткі пабудовы канчаткова разабралі ў пасляваенны час. Друз і каменні ад царквы мясцовыя жыхары вывезлі за Рыбакі на Вілію, дзе ўмацавалі імі бераг ад размыву.

У міжваенны час вернікі адбудавалі на ранейшым, намоленым стагоддзямі, месцы новы храм з бетонных блокаў. Ведаючы, з якімі цяжкасцямі давялося сутыкнуцца пры яго будаўніцтве ў тыя часы, уражвае моцнае жаданне адрадзіць храм на спрадвечным месцы. Няйначай глыбокая вера тутэйшых жыхароў дапамагла ў гэтай пачэснай справе.

Уладзімір ПРЫХАЧ

Белы параход на Прыпяці

На Тураўшчыне, у міжрэччы Прыпяці і Сцвігі, раскінулася вёска Пагост — адно з найпрыгажэйшых і маляўнічых месцаў Беларусі. «З віядука ў красавіцка-майскую квецень вёска здалёк нагадвае вялізны белы параход, незвычайны па форме, які быццам плыве па звілістай стужцы Прыпяці…» — піша пра родную мясціну карэнны жыхар Міхаіл Кузьміч у кнізе «Мой Пагост».

Паселішча праз два гады адзначыць 500-годдзе. Размешчанае за 20 хвілін язды ад горада Жыткавічы, яно славіцца старажытнасцямі і рэліквіямі, выяўленымі ў наваколлі, шанаваным каменным крыжом, легендамі, народным мастацкім калектывам «Міжрэчча», самабытнымі людзьмі, іх справамі на карысць малой радзімы. Менавіта пра гэта і шмат пра што іншае можна даведацца з прыгожа ілюстраванай кнігі. Напісаў яе кандыдат філасофскіх навук, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, член Акадэміі расійскай літаратуры, складальнік і рэдактар навукова-папулярных і даведачных кніг, аўтар зборнікаў публіцыстыкі і літаратурна-крытычных артыкулаў «Стрела в бесконечность», «У костра в вечерний час», шматлікіх публікацый у беларускіх і расійскіх выданнях Міхаіл Кузьміч.

У гісторыка-дакументальнай хроніцы «Мой Пагост» аўтар дэталёва прасочвае гістарычны шлях малой радзімы, лёсавызначальныя для жыхароў вёскі падзеі. Паводле Міхаіла Кузьміча, няма чалавека без радзімы — вялікай духоўнай крыніцы. Шчасце, калі ёсць яна — маленькая кропка на карце.

Міхась СЛІВА

У Забашавічы — з новай кнігай

Аграгарадок Забашавічы Барысаўскага раёна адзначыў 500-гадовы юбілей. Выдавецтва «Чатыры чвэрці» падтрымала значную падзею прэзентацыяй новай кнігі «Забашавічы», выпушчанай у серыі «Малая радзіма: Барысаўскі раён».

Ва ўрачыстасцях бралі ўдзел калектывы Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І. Х. Каладзеева, Забашавіцкай школы, клуба, музея і іншых устаноў. Протаіерэй Аляксандр (Пачэпка) разам з айцом Андрэем (Шабалоўскім) здзейснілі богаслужэнне. Каля царквы Пакрова Прасвятой Багародзіцы (на жаль, царква страчана ў 1950-х гг. і перабудавана; у пачатку 2000-х гг. адрэстаўравана і цяпер размяшчаецца ў старажытным будынку былога панскага млына) для ўсіх зацікаўленых былі прадэманстраваны важныя моманты з жыцця прыхода: архіўныя дакументы, духоўныя кнігі.

Протаіерэй Аляксандр (Пачэпка) заўважыў блізкасць дат — першай згадкі вёскі Забашавічы і выпуску першай друкаванай кнігі на ўсходнеславянскіх землях Францыскам Скарынам, нягледзячы на тое, што духоўнае жыццё аграгарадка пачынае адлік пазней. Святар таксама перадаў экзэмпляры «Новага Запавету» ў фонды Забашавіцкай бібліятэкі і выдавецтва «Чатыры чвэрці».

Супрацоўнікі выдавецтва «Чатыры чвэрці» павіншавалі Забашавіцкую бібліятэку вялікай падборкай кніг і альбомаў, а таксама ўручылі падарункі гасцям. Ліліяна Анцух, дырэктар і галоўны рэдактар выдавецтва, якая прэзентавала кнігу «Забашавічы», заўважыла, што сёння гэты край цікавіць не толькі тых, хто тут жыве. Даследчыкі, навукоўцы, краязнаўцы, царкоўныя гісторыкі займаюцца вывучэннем дакументальных крыніц, археалагічных знаходак, таму што падзеі, якія адбываліся тут, паўплывалі на ўсю айчынную гісторыю.

У новай кнізе «Забашавічы», трэцяй з серыі «Малая радзіма» (пабачылі свет «Землякі: вёска Леванова» і «Лошніца»), упершыню пад адной вокладкай аб'яднаны арыгінальныя, выкладзеныя па-беларуску матэрыялы, якія распавядаюць пра гісторыю, а таксама пра духоўнае жыццё і сённяшні дзень вёскі.

Марыя ЛІПНІЦКАЯ

АДМЕТНЫЯ ВЫСТАЎКІ ВЕРАСНЯ

З пачаткам восені культурнае жыццё ў краіне ажывае. Музеі і мастацкія галерэі спрабуць выклікаць у гледачоў разнастайныя эмоцыі. Якімі творчымі праектамі можна натхніцца?

Работа Настассі Колас.

1 МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ «АРТ-БЕЛАРУСЬ»

У межах культурнай прасторы дэманструецца цікавы праект «*Women in action*», прысвечаны паспяховым беларускім жанчынам у розных сферах. Арганізатары вырашылі нагадаць беларускам, што яны нясуць у сабе магутны асобасны патэнцыял, незямную прыгажосць і наперадзе іх абавязкова чакае поспех.

Падрыхтоўка праекта была дастаткова доўгая. У цэнтры ўвагі — выстаўка «Пярэварацень» Настассі Колас, работы якой звязаны з Беларуссю і ўпісаны ў сусветны кантэкст. Мастачка нарадзілася ў Мінску, жыве ў Таронта. З дапамогай прасторавых інсталяцый, скульптуры і лінзавых прыстасаванняў яна дамагаецца трансфармацыі вобразаў. У сваіх кампазіцыях аўтарка разглядае ўплыў на грамадства прадуктаў глабалізаванай эстэтычнай творчасці і тое, як яны засвойваюцца ў асяроддзі розных мясцовых супольнасцяў. Настасся заклікае гледачоў зазірнуць за матэрыяльную абалонку твораў.

У рамках праекта прапануюцца сустрэчы са знакамітымі жанчынамі — Настассяй Колас, мастачкай Эвелінай Домніч, якая працуе ў жанры *Art Science*, што аб'ядноўвае мастацтва, навуку і філасофскія практыкі. Наперадзе — сустрэча з публіцысткай і экаахоўніцай Таццянай Новікавай і размова з Яўгеніяй Андраюк пра тое, што ёсць чалавечая годнасць. Падчас сустрэч слухачы могуць задаваць гераіням адкрытыя пытанні, каб зразумець, у чым сакрэт іх поспеху.

Іван Дмухайла «Прывакзальная плошча 1950-х».

2 МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ «ВЫСОКАЕ МЕСЦА»

Калекцыянеры Аляксандр і Іна Радаевы прадстаўляюць выстаўку з прыватнай калекцыі «Мінск. Горад і людзі». У экспазіцыі прадстаўлена больш за 60 жывапісных і графічных работ, сярод якіх можна ўбачыць цэнтральныя вуліцы ў жывапісных работах Міхаіла Чэпіка «Мост над Свіслаччу» і Абрама Кроля «Плошча Леніна», графічных аркушах Сямёна Геруса «Круглая плошча» і Анатоля Тычыны «Праспект Сталіна». Можна ўспомніць тую ж Прывакзальную плошчу ўзору 1967 года, што застанецца ў гісторыі ў невялікай лінагравюры Арлена Кашкурэвіча.

У кагосьці пакіне сумнае ўражанне разбураны Мінск часоў акупацыі ў рабоце 1943 года «Мінск. Руіны» Мікалая Дучыца і пасляваенныя руіны сталіцы на палотнах Віталя Цвіркі «Мінск» 1944 года і «Зімовы дзень. Ускраіна Мінска» 1946 года. А ў творы Меера Аксельрода 1928 года захаваны вядомы двухпавярховы дом з чырвонай цэглы, які стаяў у раёне Ніжняга рынка і які знеслі яшчэ да вайны…

Калекцыянеры Іна і Аляксандр Радаевы ўпэўненыя, што горад — гэта не толькі будынкі, але яшчэ і людзі, якія напаўняюць прастору энергіяй: напрыклад, у творы Уладзіміра Стальмашонка «Пасля змены на заводзе», Альгерда Малішэўскага «Рабочыя на вуліцы», Аляксандра Сямілетава «Сталявар», Леаніда Шчамялёва «Незнаёмка»…

Твор Вольгі Шкарубы.

3 МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ «БЕЛАРТ»

Выстаўка жывапісу мужа і жонкі Вадзіма Богдана і Вольгі Шкарубы толькі адкрылася ў сценах галерэі. Мастакі ў творчасці абсалютна не падобныя адзін на аднаго, але разам іх работы ўспрымаюцца гарманічна.

Вольга — натура імпульсіўная, часам незадаволеная вынікам. Бо знаходзіцца ў пошуку новых тэм і спосабаў іх увасаблення. Але пры на эксперыменце атрымліваюцца шчырыя і лірычныя карціны. Іх можна назваць своеасаблівымі паэтычнымі назіраннямі за станам прыроды. Знаходзячыся ў палоне разнастайных уражанняў, Вольга імкнецца максімальна выразна зафіксаваць характар з'яў прыроды і прадметы, адлюстраваць уласнае здзіўленне і захапленне. Яна выказвае сваё стаўленне да тэмы непасрэдна ў працэсе працы, адразу на палатне. Гэта спроба ўцягнуць гледача ў працэс стварэння.

Вадзім Богдан крок за крокам удасканальвае майстэрства малюнка, набывае ўпэўненасць і вызначае кола сваіх творчых інтарэсаў і прыхільнасцяў. Ад твора да твора ён ставіць перад сабой новыя мэты і паспяхова вырашае складаныя творчыя задачы. У яго светаадчуванні няма дысанансу, карціны ўспрымаюцца як адзін акорд сімфоніі фарбаў. У пейзажных творах уражанні мастака злучаюцца з аўтарскай фантазіяй, у іх ёсць тое няўлоўнае дыханне прыроды, што, як правіла, знаходзіць эмацыянальны водгук.

Срэбны выраб з калекцыі Маскоўскай ювелірнай школы.

4 НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Тут працуе выстаўка са збору Дзяржаўнага гістарычнага музея Масквы «Сярэбраны век ювеліраў Расіі».

Маскоўская ювелірная школа прадстаўлена вырабамі сусветна вядомай фірмы Ільі Губкіна, прыдворнага пастаўшчыка Расійскага імператарскага двара, і майстэрні Ільі Аўчыннікава, заслугай якой з'яўляецца адраджэнне і развіццё нацыянальнага стылю. У экспазіцыі — творы фірмы Івана Хлебнікава, які спецыялізаваўся на вытворчасці дыяментавых, залатых і срэбных вырабаў.

Прадметы побыту арыстакратаў не адрозніваюцца візуальнай раскошай, але кожны з іх — шэдэўр мастацтва і прыклад філіграннай працы. Як, напрыклад, цукарніца майстэрні Аўчыннікава, прыкрытая сурвэткай. Толькі праз пару секунд разумееш: сурвэтка насамрэч таксама зробленая са срэбра, але майстры здолелі надзвычай тонка перадаць узор і фактуру тканіны. Уражвае і птушка Сірын — з-пад рук Фабержэ, — крылы якой упрыгожаны простым ружовым кварцам.

Падрыхтоўка да прыезду ювелірных шэдэўраў у музейшчыкаў заняла амаль год. Але выстаўка атрымалася незвычайна цікавая і захапляльная.

Ганна Сілівончык «Незвычайнае і неадназначнае».

5 ДОМ МАСКВЫ

Выставачна-творчы праект «Культурная дыпламатыя. Масквічы ў Беларусі, беларусы ў Маскве» арганізаваны, каб прадэманстраваць актуальнае мастацтва ў дзвюх краінах. У праекце задзейнічаны адразу тры пляцоўкі. Акрамя Дома Масквы экспазіцыя размясцілася ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» і Музеі тэатральнай і музычнай культуры.

У экспазіцыі прадстаўлены карціны такіх знакамітых і адметных беларускіх мастакоў, як Васіль Касцючэнка, Леанід Гоманаў, Валерый Славук, Рыгор Іваноў, Аксана Аракчэева, Надзея Бука, Васіль Пяшкун, Ганна Сілівончык, і іншых. Яркім дадаткам стануць творы вядомых расійскіх аўтараў, напрыклад, Андрэя Очнева, Валянціна Чопыка, Васіля Худзякова, Алены Хайлавай, Таццяны Халева…

Дзякуючы праекту гледачы змогуць параўнаць мастацкае майстэрства творцаў двух гарадоў, прааналізаваць асаблівасці беларускай і расійскай школ выяўленчага мастацтва, а таксама асабіста пазнаёміцца з некаторымі мастакамі: у межах выстаўкі запланаваныя майстар-класы творцаў дзвюх краін.

Матэрыялы паласы падрыхтавала Вікторыя АСКЕРА

Жыццё ў рэжыме анлайн

Шэкспіраўскі тэатр ажывае на экране сцэнічнага смартфона

Перад'юбілейны 99 сезон пачаўся ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы з прэм'ернага паказу пастаноўкі расійскага рэжысёра Андрэя Прыкатэнкі «Сон у купальскую ноч». Менавіта ёй саступіла месца традыцыйная «Паўлінка»: прычыны для гэтага былі выключна практычныя, а не ідэйныя. Галоўны рэжысёр Новасібірскага дзяржаўнага драматычнага тэатра «Стары дом», уладальнік спецыяльнага прыза Расійскага нацыянальнага тэатральнага фестывалю і прэміі «Залатая маска» Андрэй Прыкатэнка падрыхтаваў складаны з тэхнічнага пункту гледжання спектакль, які дэманструе ўсе магчымасці сцэны Купалаўскага і патрабуе адмысловай арганізацыі прасторы.

Размяшчэнне гледачоў звычайнае (у партэры, бельэтажы, на балконе) і не вельмі: месцы прадугледжаны нават на самой сцэне. Здаецца, глядач на сцэне — што тут наватарскага? Беларускія тэатралы ўжо не раз назіралі прыём, калі рэжысёр набліжае аўдыторыю да падзей спектакля не толькі эмацыянальна праз актуальны сюжэт, але і наўпрост фізічна, пераносячы гледачоў на месца дзеяння да артыстаў. Але такія спектаклі звычайна ладзяць на эксперыментальных пляцоўках ды ў камерных залах; узняць гледачоў на вялікую сцэну аднаго з галоўных дзяржаўных тэатраў краіны — зусім іншая справа. Да таго ж тых, хто сядзіць вакол куба з галаграфічным пакрыццём, далучаюць да спектакля як масоўку: на пачатку дзеі акцёры паведамляюць, што аўдыторыя на сцэне — гэта світа Абярона і Тытаніі, бо «Усе мы эльфы!». Але інтэрактыўнасць тут толькі намінальная і ад гледачоў нічога не патрабуецца.

Тэхнічнае абсталяванне выступае не проста як фон, а як своеасаблівы ўдзельнік спектакля. Куб адначасова хавае і адкрывае персанажаў, падрабязнасці іх жыцця трансліруюцца на яго празрыстыя сцены. Героі быццам існуюць у гэтай віртуальнай прасторы, што дадае дзеі пэўнай фантастычнасці, патрэбнай для стварэння атмасферы сну. Здаецца, у такой пастаноўцы артысты могуць зрабіць на сцэне што заўгодна: месца дзеяння — сон, дзе ўсё дазволена, бо адбываецца не па-сапраўднаму. Часткай спектакля становіцца нават тэкст шэкспіраўскага «Сну ў летнюю ноч»: словы стыльна ўзнікаюць на паверхні куба, спалучаюць арыгінальную англійскую і беларускую мовы. З дапамогай тэхнічных эфектаў ды імправізацыі (побач з фотаздымкамі артыстаў на экране кожны раз ідзе відэарад з выявамі новых гледачоў) стваральнікі па-станоўкі імкнуліся перадаць непаўторнасць моманту, зрабіць уражанне, быццам чарговы паказ усё роўна ў нечым першы. Як у іх гэта атрымалася, кожны наведвальнік павінен адчуць на ўласным прыкладзе.

Збудаваны на сцэне куб — не новы прыём для Андрэя Прыкатэнкі: рэжысёр ужо ведае, як працаваць з гэтай прыладай, бо ў папярэднім яго спектаклі «*Sociopath*/Гамлет» выкарыстоўваецца падобная канструкцыя. «Сон у купальскую ноч» — той выпадак, калі праца мастака-сцэнографа падаецца не менш значнай за працу рэжысёра, таму творчы падыход расійскага сцэнографа і касцюмера Вольгі Шаішмелашвілі значна паўплываў на канчатковае ўспрыманне спектакля, як і праца мастака па святле Мікалая Суркова і стваральнікаў відэакантэнту Глеба Куфцерына і Міхаіла Міцькова. У сувязі з гэтым узнікла пытанне да некаторых эпізодаў: ці то выкананне чацвёркі артыстаў (Антаніны Дубатоўкі (Алена), Іларыі Шашко (Гермія), Міхаіла Світа (Лізандр) і Паўла Астравуха (Дзяметрый)) недастаткова моцнае, ці то Юлія Шпілеўская і Аляксандр Казела склалі надзвычай удалы дуэт, ці то градус візуальнага і слыхавага ўспрымання спектакля пасля яркіх нумараў узнімаецца надта высока і ўражанне ад спецэфектаў перабівае ўражанне ад гульні артыстаў, але падчас сцэн з афінскімі закаханымі месцамі пачынаеш сумаваць і чакаць эфектнага выхаду эльфаў. Магчыма, недзе падвяла работа над сцэнарыем, і трансфармацыя ў шэкспіраўскай п'есе адбываецца не толькі ў змене словазлучэння «летняя ноч» на «купальская ноч».

Перайначыць назву пастаноўкі на беларускі манер прапанаваў не Купалаўскі тэатр, а паэт Алесь Разанаў, які зрабіў для спектакля пераклад шэкспіраўскага тэксту. Купальская ноч — самы актуальны час для цудаў, да таго ж летні сонцазварот так ці інакш адзначаецца ў культуры ўсіх еўрапейскіх краін. Рэжысёр паведаміў, што ў стваральнікаў спектакля былі нават думкі цалкам перанесці дзеянне п'есы ў Мінск. Тады б закаханыя і эльфы блукалі не ў ваколіцах Афін, а шпацыравалі па вуліцах беларускай сталіцы, дзе замест афінскіх гараджан маглі б сустрэць мясцовых «пацаноў з раёна». Дарэчы, бутэлька піва ў руках Матавілы (Міхаіл Зуй) міжволі скіроўвае думкі ў сучаснае рэчышча, як і эквівалент купальскай кветкі — смартфон — у руках эльфа Робіна ў выкананні харызматычнага Паўла Харланчука (заўважна, што мабільны дадатак са зменай твараў арганічна ўпісаўся ў тэматыку метамарфозаў). Роля артыста ў гэтым спектаклі забаўляльная і адказная адначасова: ён «звязвае» сцэнічнае дзеянне і гледачоў у адну карціну, праз паводзіны блазана з дапамогай смартфона і сэлфі-палкі ўводзіць у сюжэт спектакля людзей з залы.

Фота з сайта afisha.tut.by.

Дарэчы, падчас прагляду «Сну ў купальскую ноч» узніклі асацыяцыі са спектаклем «Талерантнасць» паводле п'есы Ясміны Рэзы, якую ўвесну паставіў на сцэне Купалаўскага Мікалай Пінігін. Па некаторых пунктах яны з адной катэгорыі: там канфлікт дзвюх сямейных пар трансліраваўся на экран тэлевізара побач з выпускамі навін. Здаецца, у сучасным свеце мяжа паміж асабістым і публічным паступова знікае і назіранне за чужым жыццём становіцца нормай для большасці. Але ці ёсць гэта нормай для псіхічнага здароўя? Нягледзячы на тое, што спектакль Андрэя Прыкатэнкі не мае на мэце адшукаць адказ на гэтае пытанне, яго работа выразна ілюструе стан рэчаў: жыццё — бы ток-шоу, у якога ёсць рэжысёр і гледачы. Вядома, у спектаклі «празрыстасць» асабістага крыху прыхарошана, але ж колькі непатрэбнай і інтымнай інфармацыі пра сваіх знаёмых мы атрымліваем праз стужку навін «УКантакце», у «Фэйсбуку», «Інстаграме»! Там чужыя любоўныя пакуты і гарачыя прызнанні, поспехі і правалы, радасць і злосць пераўтвараюцца ў бесперапыннае рэаліці-шоу, дзе кожны — акцёр, уласная старонка — тэатр, а падпісчыкі — пастаянныя гледачы.

Ад «сапраўднага» віртуальнага жыцця новую інтэрпрэтацыю п'есы Шэкспіра адрознівае асоба Абярона (Аляксандр Казела). Уладар эльфаў Абярон без ваганняў вырашае лёсы іншых людзей, умешваецца ў іх любоўныя лініі, бы сапраўдны рэжысёр, які ведае, як лепей заахвоціць гледачоў да прагляду і ўзняць рэйтынгі. Але нават у наладжанай працы эльфаў існуе чалавечы фактар: слуга Робін (Павел Харланчук), якому трэба было выканаць загад цара, не надта ўвайшоў у дэталі справы і ненаўмысна (але ж праз уласную халатнасць) усё пераблытаў. Праўду кажуць: часта прасцей зрабіць самому, чым перарабляць за кімсьці іншым. У выпадку з памылкай Робіна ўсё заканчваецца добра, бо памяняць лёс чалавека ў спектаклі проста: дастаткова клікнуць па экране чароўнага смартфона.

Здаецца, што спектакль «Сон у купальскую ноч» — пра падлеткаў і ствараўся менавіта для іх. Але з разлікам на больш дарослую аўдыторыю: у душы нават сталага чалавека жыве ўспамін пра першае каханне, не згасаюць канчаткова чыстыя юнацкія мары і памкненні. Трэба толькі іх абудзіць. Для дарослых гледачоў галоўнае — не разгубіцца ад надта вялікай колькасці нязменных атрыбутаў XXI стагоддзя — смартфонаў, гіраскутараў і сэлфі-палак. Але ж усё пералічанае — толькі знешняя абалонка, галоўнае — каханне — застаецца нязменным і ў шэкспіраўскія часы, і ў эпоху інтэрнэту. Не чакайце адказаў на глабальныя пытанні, не шукайце прыхаваны ў рэпліках дадатковы сэнс. Помніце: «Сон у купальскую ноч» цалкам прысвечаны каханню. Прычым не вечнаму і трагічнаму, а першаму, лёгкаму, якое плануецца на ўсё жыццё, а ў выніку доўжыцца пяць хвілін… Абярон — і той кахае Тытанію, усе яго дзеянні выкліканы звычайнай рэўнасцю да жонкі (паднаготную асабістага жыцця гаспадара па сакрэце здае гледачам яго верны служка). Разам з тым перажыванні афінскіх закаханых не паказваюцца рэжысёрам глыбока, з чым яшчэ можна прымірыцца, калі спектакль для моладзі, але ў сталага чалавека гэта выклікае паблажлівую ўсмешку ці неразуменне: а навошта тады было паказваць гісторыю наогул? Няўжо толькі дзеля фармальных пошукаў?..

Сапраўды, спектакляў з арыгінальнай формай не стае ў айчыннай тэатральнай прасторы. І калі ёсць магчымасць бачыць прыклады падобных пастановак (з сінтэзам розных відаў мастацтваў і нават тэхналогій), якія прывозяць сюды з Еўропы, то больш востра адчуваецца вартасць нешматлікіх айчынных тэатральных эксперыментаў. Здольны захапіць ужо сам факт іх наяўнасці, асабліва ў рэпертуартных тэатрах з магутнымі традыцыямі, як Купалаўскі. Але калі спектакль «Сон у купальскую ноч» прываблівае пэўную частку маладой аўдыторыі, то ў гэтым ёсць бясспрэчная каштоўнасць — далучэнне да беларускай мовы, цудоўны ўзор якой паказаў Алесь Разанаў, пераклаўшы Шэкспіра. Можна колькі заўгодна казаць дзецям пра любоў да Радзімы, але яны самі павінны ўсвядоміць, што беларускае можа быць не толькі пра вайну ды вёску (на жаль, школьная праграма па беларускай літаратуры на працягу 11 гадоў закладвае вучням менавіта такое ўражанне), і тут дапаможа прыгожая родная мова ў сучасных пастаноўках. Тэхнічная феерыя са спевамі (дзякуй кампазітару Івану Кушніру, радкі «Тытанія, засынай» зноў і зноў гучалі ў думках, як і мае быць са звычайнай поп-мелодыяй) і нават беларускамоўным рэпам можа перавесці ўспрыманне тэатра школьнікамі ў новае рэчышча. Так, не ўсё выканана ідэальна: некаторыя радкі рэпу было цяжка разабраць нават тым, хто добра валодае мовай (з-за дынамічнасці дзеі некаторыя фразы губляліся), а тэатралы са стажам маглі паставіць пад пытанне і навізну некаторых сцэнічных рашэнняў.

…Але акцёры-эльфы лёталі па сцэне на гіраскутарах, спявалі і чыталі рэп, і часам хацелася да іх далучыцца.

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ

МОВАЙ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

Неігравы кінематограф у пошуках нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці

Напрыканцы васьмідзясятых — пачатку дзевяностых у беларускім неігравым кінематографе ўпершыню адным з галоўных тэматычных напрамкаў становіцца гісторыка-культуралагічны. Быў створаны шэраг стужак, якія спалучалі публіцыстычнасць і даследчыя метады навукова-папулярнага кінематографа.

ПРАЗ САМАПАЗНАННЕ

У дзевяностых гадах неігравы кінематограф Беларусі аказаўся ў іншай дзяржаўнай і сацыякультурнай прасторы. Пачаўся пераход і станаўленне кінематографа незалежнай краіны. Пераход у еўрапейскі кантэкст быў цесна звязаны з культуралагічным. Для беларускага неігравога, як і для ўсяго айчыннага кінамастацтва наогул, галоўным напрамкам стала развіццё нацыянальнага кінамастацта. Найбольш яскрава гэта адлюстравалася ў карэнным пераўтварэнні рэпертуарнай палітыкі на ВТА «Летапіс», якое па-ранейшаму заставалася адным з асноўных па выпуску ў краіне неігравых кінафільмаў. Асноўным матэрыялам кінастужак сталі тэмы і праблемы гісторыі і сучаснага жыцця Беларусі. Упершыню, апроч кінахронікі, якая прызначалася да ўнутранага карыстання, дакументальныя фільмы пачалі выходзіць на беларускай мове.

Асобны напрамак у кінематографе быў звязаны з вяртаннем на экран імён людзей, якія шмат зрабілі ў свой час для развіцця і станаўлення беларускай культуры. Фільмы, прысвечаныя лёсам мастакоў, пісьменнікаў, з перыферыі тэматычнага плана паступова занялі прыярытэтнае першае месца ў беларускай дакументальнай кінапрадукцыі. Стужка Ю. Цвяткова «Быў. Ёсць. Буду» (1988) пра ўнікальную асобу Уладзіміра Караткевіча адкрыла тэму і напрамак, прысвечаны творчасці і лёсу пісьменніка. Фільм створаны ў сінтэтычнай жанравa-тэматычнай мадэлі, якая спалучала літаратуразнаўчы метад з публіцыстычным асэнсаваннем. Традыцыйная біяграфічная лінія перамяжоўвалася каментарыямі і разважаннямі. Гэта мадэль была пакладзена ў аснову стужак «Цішка Гартны» (1988, рэжысёр Ю. Цвяткоў), «Вяртанне Забэйды-Суміцкага» (1990, режысёры Р. Ясінскі, Л. Гедравічус), «Паэт Алесь Гарун» (1991, сцэнарыст Б. Сачанка, рэжысёр Ю. Цвяткоў) і інш.

Стужка «Паэт Алесь Гарун» была першай спробай узнавіць на экране старонкі беларускага адраджэння, акрэсліваючы месца і ролю, якую адыграў у ім паэт. Асоба паэта Гаруна прадстаўлена ў кантэксце эпохі, якая, на думку аўтараў, вызначыла этапы яго паэзіі і светапогляду. У фільме выкарыстана шмат унікальнай архіўнай кінахронікі: Мінск 1917 года, прыезд Пілсудскага, гістарычныя мясціны, звязаныя з імёнамі М. Багдановіча, Янкі Купалы, З. Бядулі, Я. Лёсіка, А. Луцкевіча.

Фільм вызначыў новую тэндэнцыю дакументальнага кінематографа 90-х гадоў у звароце да такой складанай праблемы, як гістарычнае самапазнанне. Здольнасць «праз сваю хату ўбачыць бацькаву», на думку аднаго з удзельнікаў фільма, які працытаваў гэты выраз М. Лужаніна, акрэсліла гістарычную перспектыву беларускага народа, яго будучыню. Драматургію фільма вызначыў гістарычны ракурс. Менавіта гісторыя высвечвае сваім святлом духоўную асобу творцы. Разуменне творчай індывідуальнасці паэта аўтары фільма паспрабавалі спалучыць з перспектывай сучаснага ўспрымання і прачытання яго творчасці, грамадскай і культурнай дзейнасці.

Стужка акрэсліла новы паварот да імкнення кінематографа разабрацца ў складаных лёсах шмат якіх асоб беларускай культуры. У фільме «Вяртанне Забэйды-Суміцкага» ўпершыню кінадакументалісты паспрабавалі паведаміць з экрана пра трагічны лёс мастака-эмігранта, які, тым не менш, заўсёды заставаўся беларускім спеваком. Гэта работа вылучылася не столькі навізною формы, колькі навізною матэрыялу і тэматыкі. Музыказнаўчая і гістарычная лініі ў фільме былі аб'яднаны. «Фільм нельга разглядаць як навучальны дапаможнік школьным факультатывам. Ён значна больш шырокі па скіраванасці… Аўтары не праглі сенсацый. Чалавек, які пранёс беларускую культуру праз культурныя цэнтры Еўропы... паўстае на экране як няпростая асоба, над якой лёс, аднак, не атрымаў перамогу. У сутыкненні з гістарычнымі падзеямі ён не страціў сябе» (адзначалася ў публікацыі «Першы тэнар краіны вярнуўся» ў газеце «Знамя юности» ў 1991 годзе). Пачатковы перыяд усебаковага кінаасветніцтва аказаўся невялікім па часе, але даволі плённым па змястоўнасці. Кінадакументалістыка працягвала развіваць тэндэнцыю аднаўлення гістарычнай памяці на экране і асэнсавання сродкамі дакументальнага кіно падзей, якія раней былі амаль выключаны з афіцыйнай гісторыі. За невялікі перыяд часу была створана ўнікальная экранная кінаэнцыклапедыя гісторыі і культуры Беларусі.

ПРАЗ ПАМЯЦЬ

Тэма стаўлення да нацыянальнай памяці, суаднесенасці падзей мінулага з сучаснымі праблемамі была закладзена яшчэ ў фільме М. Жданоўскага «Ёсць у горада душа» (1988). Працяг уласных разваг рэжысёра ў гэтым кірунку, спалучэнне рацыянальнага і эмацыянальнага былі пакладзены і ў аснову карціны М. Жданоўскага «Дарога на Курапаты». З ёю ў беларускім неігравым кінематографе звязана тэндэнцыя асэнсавання гістарычных падзей на мастацка-філасофскім узроўні. У кантэксце шматлікіх артыкулаў таго часу, прысвечаных падзеям, якія разгарнуліся вакол урочышча Курапаты, стужка вылучалася не толькі сваім канцэптуальным падыходам у комплексным аналізе тэмы. Аўтары адмовіліся ад характэрных для «перабудовачнага кінематографа» выкрывальных інтанацый. Асноўная драматургічная лінія хутчэй нагадвала экраннае даследаванне эмацыянальнай памяці народа. Выяўленча-гукавы строй першых кадраў з разварочанай зямлёю і крумкачамі задалі фільму трагедыйную інтанацыю і надалі метафарычны сэнс. Запусцелае ўрочышча паўстала на экране як месца духоўнага запусцення. Для ўзнаўлення атмасферы часу аўтары адмовіліся ад такога папулярнага метаду ў новым дакументальным кіно, як «боб-слей», калі хранікальны матэрыял фільма перамяжоўваецца архіўнай хронікай у новым гістарычным кантэксце. Час ажываў на экране ў аповедах людзей. Гісторыя асэнсоўвалася ў фільме не ў адназначнай яе трактоўцы. Аўтары далі магчымасць выказацца прадстаўнікам процілеглага боку — следчаму, юрысту, былому ахоўніку. Іх разважанні ў кантэксце фільма ўзмацнілі яго трагедыйны пасыл. З канкрэтнага матэрыялу стужка выйшла на такія адвечныя пытанні жыцця, як сумленне, пакаянне, маральнасць… У 2007 г. рэжысёр зноў звярнуўся да гэтай тэмы ў фільме «Ва ўсе дні» ўжо праз маральна-філасофскі ракурс.

Кадр з фільма «Дарога на Курапаты».

Тэма дарогі як шляху ў мінулае стала асноўнай і ў фільме Ю. Лысятава «Я выжывала шмат разоў» па сцэнарыі С. Алексіевіч (1990). Драматургія стужкі пабудавана як вандроўка Маі Кляшторнай, дачкі беларускага паэта Т. Кляшторнага, што загінуў у 1937-м, у Караганду. Падарожжа да былога лагера, якое было здзейснена гераіняй больш чым праз 50 гадоў, набыло ў фільме метафарычны сэнс. Кінематаграфісты не проста ўзнаўлялі разам са сваімі героямі месцы канкрэтных гістарычных падзей — дакументалісты імкнуліся стварыць вобраз часоў, якія былі белымі плямамі ў айчыннай гісторыі, праз канкрэтныя чалавечыя лёсы.

ПРАЗ АСОБ

На студыі «Летапіс» ствараліся стужкі пра падзеі даўніны і найноўшай гісторыі: «Рэха збройнага чыну» (рэжысёр С. Гайдук, 1992) — пра гісторыю слуцкага паўстання і «Жаўрукі Беларусі» (рэжысёр М. Жданоўскі, 1993) — пра палітычную цэнзуру. На экран вярнулася шмат імён дзеячаў беларускай гісторыі і культуры: Яна Чачота («Вечны выгнаннік», рэжысёр В. Сукманаў, 1993), Канстанціна Астрожскага («Гетман найвышэйшы», рэжысёр У. Каралёў), Тадэвуша Касцюшкі («Паланэз для касінераў», рэжысёр Р. Ясінскі, 1994), Ларысы Геніюш («Вянок цярновы васількоў», рэжысёр С. Гайдук, 1992), Міколы Равенскага («Успамін пра Міколу Равенскага», рэжысёр М. Жданоўскі, 1994) і інш. С. Гайдук у садружнасці з пісьменнікам У. Арловым стварылі цыкл фільмаў пра падзеі і гістарычных асоб з унікальнай гісторыі Полацка.

Асобна вылучыліся напрамкі, звязаныя з кінаінтэрпрэтацыяй тэмы прафесійнага і непрафесійнага мастацтва. Дакументальны экран звярнуўся да носьбітаў народнай творчасці. Стужкі пра іх не проста фіксавалі адыходны культурны слой. Разам з фільмамі-даследаваннямі пра старых людзей як выразнікаў нацыянальнага архетыпу яны сталі часткай экраннага даследавання нацыянальнага этнасу. Фільмы «*Con anima* (З душою)» (1992) М. Жданоўскага, «Ой, лятала шэра перапёлка» (1993) С. Пятроўскага, «Слёзы блуднага сына» (1994) В. Аслюка, адзначаныя ўзнагародамі «Панарамы беларускага кіно», сталі знакавымі для таго часу ў распрацоўцы неігравым кінематографам краіны яго галоўных кірункаў — гісторыка-культуралагічнага і мастацтвазнаўчага.

У 90-х гадах, пасля дакументальнага «выбуху» і адыходу ад «імгненнасці», у неігравым кіно выявілася праблема прафесіяналізму і авалодання кінамовай. На развіццё паэтыкі неігравога фільма аказалі ўплыў і такія важкія абставіны, як развіццё відэа і пераход да новага спосабу існавання фільмаў. Новая мадэль кінематографа, заснаваная на прынцыпах самаакупнасці, асабліва бязлітаснай аказалася для тых, хто працаваў у неігравым кінематографе. Дакументальныя кінафільмы пачалі вельмі рэдка дэманстраваць у кінатэатрах. Перыяд «дакументальнага буму» пераходзіў у іншую стадыю, калі асноўным сродкам выхаду да гледача заставаўся тэлевізійны экран. Неігравое кіно ўступіла ў новую фазу існавання. «Быў выбух, але мог бы быць і ўзлёт. Узлёту сапраўды не адбылося, хаця ў цэлым экран неігравога кіно пашырыў свой дыяпазон, павысіў планку» (адзначалася ў даследаванні «Документальное кино эпохи реформаторства», 2001 г.).

У неігравым кіно пачаў адбывацца працэс знікнення відавых адрозненняў паміж дакументальным і навукова-папулярным кінематографам, дакументальным кіна- і тэлефільмам. Гэта было як адлюстраваннем тэндэнцый узаемаўплыву неігравых відаў кінамастацтва і з'яўлення новых экранных мадэляў, так і вынікам існавання кароткаметражнага неігравога кіно ў новай культуралагічнай і эканамічнай сітуацыі.

На развіццё дакументальнага кінематографа зрабіў уплыў і прыход новага пакалення рэжысёраў. Упершыню ў гісторыі айчыннага кінематографа ў неігравым кіно Беларусі з'явіліся рэжысёры нацыянальнага выпуску Беларускай акадэміі мастацтваў (майстэрня В. Дашука). З творчасцю В. Аслюка, Г. Адамовіч і С. Галавецкага (выпускнік Усесаюзнага дзяржаўнага інстытута кінематаграфіі) былі звязаны ў айчыннай дакументалістыцы новыя тэматычныя і эстэтычныя пошукі.

Галіна ШУР

Опера: гуляць па-даросламу

Матывы і малітвы Маргарыты Ляўчук

Па конкурсах, у якіх перамагло сапрана Маргарыты ЛЯЎЧУК, можна складаць еўрапейскую мапу музыкі. Белана, Пезара, Берлін — спіс не скончаны. А зыходным пунктам музычнага падарожжа артысткі стаў мінскі Музычны дом «Класіка». Наша размова з ёй — пра мары і рэчаіснасць, гукі і цішыню.

— Беларускія прыхільнікі класічнай музыкі ведаюць вас найперш як салістку Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета і Музычнага дома «Класіка». Але вашы музычныя здольнасці праявіліся далёка ад сталіцы — на Брэстчыне, у вёсцы Страдзеч. Якое яно было, ваша вясковае жыццё?

— У мяне было цудоўнае дзяцінства! І хаця мае бацькі былі небагатыя — тата працаваў у калгасе токарам, а мама была медсястрой, — я ніколі не адчувала нястачы ў чымсьці. З ранніх гадоў блізкія прывівалі мне добры густ, куплялі модныя сукенкі і сачылі, каб маё маўленне было чыстае і прыгожае. Вясковыя дзеці, безумоўна, адрозніваліся ад гарадскіх. Але гэтую розніцу я адчула толькі тады, калі сама пераехала ў горад. А ў тыя часы мне проста было хораша ў сваім асяроддзі.

Жаданне стаць спявачкай прыйшло таксама ў маленстве. У мяне была гульня: я брала ў рукі скакалку, уяўляла, што гэта мікрафон, і давала канцэрты сябрам. А яшчэ вельмі любіла прымяраць маміны строі і спяваць перад люстэркам любімыя песні. Аднак вучыцца музыцы я пачала досыць позна — ажно ў пятым класе. Гэта звязана з тым, што ў маёй вёсцы няма музычнай школы, і на ўрокі мне даводзілася ездзіць у Брэст. Акрамя музыкі, у мяне быў драматычны гурток, школьная каманда КВЗ і хор па нядзелях. Цяпер нават не ўяўляю, як я магла класціся спаць апоўначы, а ўжо а шостай гадзіне раніцы ехаць у цягніку на заняткі… Ведаеце, жаданне затрымацца ў вялікім горадзе — гэта моцны штуршок для працы.

— Пасля музычнай школы і навучання ў Брэсцкім дзяржаўным музычным каледжы імя Р. Шырмы вы паступілі ў Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі. Якімі запомніліся першыя месяцы ў сталіцы?

— Безумоўна, з абдымкамі мяне тут ніхто не чакаў. Заўсёды буду ўдзячная родным, якія мяне прынялі, хаця самі жылі ў інтэрнаце. Прыехала паступаць і зразумела, што месцы ў БДАМ атрымаюць тыя, хто даўно займаецца з мінскімі выкладчыкамі. Я паступіла, але на платнай аснове. Навучанне ў акадэміі будуецца такім чынам: першыя два гады падрыхтоўчыя, а вось ужо астатнія курсы — асноўныя. І гэтыя два гады падрыхтоўкі я імкнулася даказаць, што нічым не горшая за астатніх і магу мець бясплатнае месца вучобы. Атрымалася. На асноўныя курсы я паступіла з усімі «дзясяткамі».

— Пасля заканчэння акадэміі пачалася стажыроўка ў Вялікім тэатры. Але спачатку вы атрымалі адмову, прычына якой — залішак галасоў сапрана. Якіх спевакоў не хапае беларускай оперы?

— Найбольш распаўсюджаныя галасы — гэта сапрана і барытон. А найбольш рэдкія — тэнар і мецца-сапрана.

— Сёння мы можам назіраць, як опернае мастацтва выходзіць з-за строгіх сцен тэатра і адкрыта гучыць на вуліцы, на забаўляльных пляцоўках. Напрыклад, вы бралі ўдзел у фестывалі «Класіка ля Ратушы», выконвалі ролю княгіні Радзівіл на гістарычных квэстах у Нясвіжскім палацы. А якія новыя фарматы оперы распаўсюджаны за мяжой?

— Нядаўна я была ў Італіі і бачыла, што ў оперныя тэатры людзі прыходзяць абавязкова з дзецьмі. Уяўляеце, ёсць нават немаўляткі. Людзі з нараджэння знаёмяцца з мастацтвам. Дзіцячы квіток каштуе вельмі танна — адзін еўра. Што датычыцца класікі на вуліцы, то яна існуе нават у выглядзе флэшмобаў. Напрыклад, перад пачаткам спектакля выходзяць артысты, іх спеў падхопліваецца публікай, і такім чынам мінакі, якія маглі і не ведаць пра пачатак пастаноўкі, пачынаюць цікавіцца і заходзіць у тэатр. Трэба сказаць, што цікавасць да класічных твораў захоўваецца, але сучасныя еўрапейскія пастаноўкі набываюць пэўны эпатаж: на сцэну выязджаюць машыны, выбягаюць сабакі, часам спектакль нагадвае вечарыну. Захоўваецца вялікая цікавасць да оперных тэатраў.

— Сёлета вы атрымалі перамогу на міжнародных музычных конкурсах у Італіі і Германіі. Як выбіраеце праекты для ўдзелу?

— Мне пашчасціла мець выдатнага агента Аляксандра Чахоўскага, які з'яўляецца дырэктарам Музычнага дома «Класіка». Менавіта Чахоўскі сочыць за конкурсамі і фестывалямі класічнай музыкі і, калі знаходзіць штосьці цікавае, прапаноўвае ўзяць удзел. Так мы супрацоўнічаем ужо чатыры гады. Артысту вельмі патрэбны чалавек, які можа дапамагчы вырашыць арганізацыйныя пытанні.

— Сусветная сцэна патрабуе выконваць оперу на мове арыгінала. Вам даводзілася спяваць на англійскай, італьянскай, нямецкай мовах. Як ідзе падрыхтоўчая работа ў такіх выпадках?

— Недахоп музычнай адукацыі — у тым, што замежнай мове не ўдзяляецца патрэбнай увагі. За мяжой ёсць спецыяльныя настаўнікі, якія працуюць разам са студэнтамі над правільным вымаўленнем. Першым званочкам, што трэба пільна працаваць над тэкстам, стаў конкурс, на якім маё выкананне было сапсавана менавіта праз вымаўленне. Мова — адзін з асноўных крытэрыяў на оперных конкурсах. І цяпер я прашу моўных носьбітаў дапамагчы мне з дакладным гучаннем тэксту, шмат разоў прамаўляю кожнае слова, шмат слухаю замежных выканаўцаў. Хутка мяне чакаюць чатыры акты оперы на французскай. А па-французску я нават не чытаю… Гэта вялікая праблема. Заўсёды трэба памятаць, што ў зале ёсць слухачы, якія разумеюць, пра што ты спяваеш.

— Яшчэ адным важным пытаннем для опернага спевака застаецца акцёрскае майстэрства. Вашы нумары на тэлевізійным праекце «Вялікая опера» неаднаразова хвалілі за артыстызм і нават называлі кінематаграфічнымі. Як працуеце над гэтым складнікам выступлення?

— Чалавек можа спяваць выдатна, але гэтага недастаткова для оперы. Заняткаў па акцёрскім майстэрстве ў музычнай акадэміі няшмат. Артыстызму стараюся вучыцца самастойна. Уважліва гляджу фільмы, стараюся ўлавіць цікавыя інтанацыі, жэсты. Сачу, якія ёсць акцёрскія знаходкі ў выдатных класічных выканаўцаў. І, якім бы дзіўным гэта ні здавалася, на мой цяперашні артыстызм моцна паўплываў вясковы драматычны гурток — у дзяцінстве нас там вучылі расказваць вершы на памяць.

— Многія выканаўцы класікі скептычна, а часам нават і варожа ставяцца да эстраднай музыкі. Вы ж, наадварот, сцвярджалі, што ў папулярных артыстаў ёсць чаму павучыцца. На што варта звярнуць увагу?

— Па-першае, я стараюся слухаць сучасную музыку проста дзеля разумення музычнай сітуацыі. А па-другое, мне вельмі цікава, як працуюць мае равеснікі па-за класічнай сферай. Я падпісваюся на старонкі многіх артыстаў у сацыяльных сетках. І, ведаеце, яны — цудоўныя матыватары! Я пагляджу, колькі ў іх гастроляў, рэпетыцый, альбомаў — і адразу хочацца вучыць мовы і працаваць над новымі партыямі. Мне часта пішуць маладыя людзі, якія толькі пачынаюць чымсьці займацца, што мая творчасць іх натхняе, дапамае паверыць у сябе. Таму трэба старацца, каб быць прыкладам для іншых.

— А чыя творчая біяграфія для вас найбольш павучальная?

— Для мяне павучальным здаецца шлях італьянскага спевака Андрэа Бачэлі. Артыстам ён стаў не адразу. Яму адмаўлялі з працай, а ён усё працягваў дасылаць запісы, рэзюме — быў сам сабе менеджарам. І дасягнуў-такі, чаго хацеў. Вось мне не хапае такой актыўнасці. Часам мяне трэба падштурхнуць, каб за штосьці ўзялася. І яшчэ прыкладам для мяне з'яўляецца выдатны тэнар Беньяміна Джылы. Калісьці мяне вельмі ўразілі яго разважанні пра бязлітаснасць артыста да сваіх пачуццяў. Ён пісаў, што аднойчы перад спектаклем атрымаў ліст, у якім было сказана аб смерці яго маці. Не ўяўляю, як спяваць пасля такога… А ён выйшаў і выконваў оперу. Артыст мусіць пакідаць свае перажыванні далёка ад сцэны. Адна справа — калі ты ў цудоўным настроі спяваеш і ведаеш, што ў зале цябе слухае каханы, і зусім іншая — калі ў цябе здарылася гора. У дзень, калі памёр мой любімы дзядуля, я павінна была выконваць «Авэ Марыю» на канцэрце ў касцёле. Памятаю, як усе мне ўсміхаліся, апладзіравалі і ніхто не здагадваўся, што прагучаў не проста твор, а малітва за блізкага чалавека. Публіцы ўсё адно, у якім ты стане. Публіцы патрэбна музыка. Умець спяваць, калі хочацца плакаць, — вось чаму я хачу навучыцца ў вялікіх майстроў.

— Аднойчы вы сказалі, што кожнаму спеваку патрэбна паўза. Колькі яна доўжыцца і што хочацца рабіць, калі не гучыць музыка?

— Я не магу дакладна сказаць, колькі разоў на год мне трэба зрабіць перапынак. Часам адчуваю, што сёння спявала зашмат — значыць, заўтра пашкадую связкі і папрацую меней. Гэта таксама паўза. Падчас адпачынку галоўнае — гэта адключыць тэлефон і не слухаць музыку. Яшчэ я вельмі люблю заставацца адна. Адна — каб навесці парадак, адна — каб паглядзець кіно. І ўсё гэта дзеля захавання голасу.

Марыя СТРАХ

Сілуэты Спадчыны

Аўтарскі праект Уладзіміра Цвіркі

СЫНКАВІЧЫ

Пра гэтую культавую пабудову шмат чаго пісалі. Але чытаць — адно, сапраўднае знаёмства — праз уражанні і пачуцці, якія ўзнікаюць пры сустрэчы, і тое непадробнае захапленне, што адразу палоніць гледача, зачароўвае, доўга не адпускае. І так заўсёды, нягледзячы на тое, што каля сцен ужо чацвёрты раз! Здаецца, хопіць здзіўляцца ўбачаным, але не — кожны наступны раз, як ні дзіўна, нешта адкрываецца, узнікае новае, неспазнанае. Можа, у гэтым і ёсць нейкая асаблівая, нават магічная рыса прыгажуні царквы ў вёсцы Сынкавічы Зэльвенскага раёна.

Узрост архітэктурнага помніка вялікі, але дакладную дату пабудовы не бярэцца агучыць ні адзін даследчык даўніны. Чым больш спрэчак у гэтым кірунку, тым больш зразумела, што адкрываць і вяртаць гісторыю нашай краіны давядзецца яшчэ вельмі доўга. Бо губляць, як высвятляецца, лёгка, а вось узбагачаць і папаўняць скарбонку мінуўшчыны — марудна і нават балюча. Учарашні дзень вельмі складаны, разнастайны, недзе нават нязручны, непрывабны. Але і такую гісторыю трэба ведаць, памятаць, вучыць. Толькі пры такіх адносінах мы дасканала будзем ведаць, як пазбегнуць памылак, зробленых у мінулым. Памятаць, але не быць злапамятным — адметны паказчык грамадства, якое сябе паважае, захоўвае, пазнае і вывучае сваю гісторыю без выключэнняў.

Дык што нам вядома пра ўзрост святыні ў Сынкавічах? Першая дата, якая згадваецца часта, — канец XV стагоддзя. Ёсць і другая, якой настойліва аперыруюць навукоўцы ў галіне архітэктуры, — пачатак ці першая палова XVI стагоддзя. Разбежка, пагадзіцеся, складае добрых сто гадоў! А пакуль прыкладваюцца немалыя намаганні ў пошуку больш падрабязных і дасканалых гістарычных звестак пра час узвядзення гэтага архітэктурнага цуду, давайце спынімся на падзеях, якія зафіксаваны ў архівах. 1841 і 1881 гады згадваюцца як час, калі ў царкве праводзіліся рамонтныя работы. Навошта гэта спатрэбілася? Ці з цягам часу дах патрабаваў замены, ці паміж гэтымі датамі адбыліся больш значныя змены ў жыцці храма. Напрыклад, святыню перавялі з адной рэлігійнай канфесіі ў другую. Менавіта тады была пабудавана новая драўляная вежа над апсідай, а купал, які дагэтуль узвышаўся над галоўнай часткай храма, наогул быў знесены. Як ён выглядаў і чаму так мянялася аблічча царквы, на жаль, невядома. Ды званіцу з цэглы і каменю пабудавалі перад галоўным уваходам у 1891 годзе.

Што датычыць архітэктурнага стылю, то тут яўна прысутнічаюць рысы рэнесансу з готыкай. Дзякуючы непараўнальнаму іх спалучэнню і асаблівасцям будоўлі ў выніку атрымаўся храм абарончага тыпу. Можа, з-за гэтай акалічнасці і з'явілася легенда, што гэта наогул не культавая пабудова, а прускі абарончы замак, які быў пастаўлены на землях Вялікага Княства Літоўскага, і толькі з цягам часу яго перабудавалі ў храм.

Асабліва мне падабаецца такая нечаканая і захапляльная акалічнасць у доўгім жыцці сынкавіцкай святыні, якую сёння мы ведаем як царкву ў гонар святога Архангела Міхаіла. Трэба збіраць і беражліва захоўваць усё, што датычыцца нашай шматвяковай гісторыі, у тым ліку розныя паданні і легенды. Бо і яны ўзнікалі не на пустым месцы. Цалкам верагодна, што ў аснове кожнай — гістарычны факт. Выдатным прыкладам служыць легенда пра Трою.

…Каля ціхай прасёлкавай дарогі стаіць, задуменна ўглядаючыся ў навакольныя абшары, сынкавіцкі храм. Стаіць асобна, але, здаецца, у нейкай велічнай адзіноце, як быццам усёй сваёй надзейнай постаццю кажа: «Глядзіце, які я непаўторны, непадуладны часу і тым нялёгкім падзеям мінулага, што разбіліся ў рэшце рэшт аб мяне як аб магутную скалу».

У нейкім сэнсе так яно і адбылося, і таму храм тут, побач з намі, яшчэ вельмі і вельмі надоўга.

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі: Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар Ларыса Іванаўна ЦІМОШЫК

Рэдакцыйная калегія:
Тацяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 292-20-51
намеснік галоўнага рэдактара — 292-43-03
адказны сакратар — 292-20-51
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 292-56-53
аддзел прозы і паэзіі — 292-56-53
аддзел мастацтва — 292-20-51
бухгалтэрыя — 287-18-14

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Нумар падпісаны ў друк 20.09.2018 у 11.00

Ум. друк. арк. 3,72

Наклад — 1304

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 220013

Заказ — 3456

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.